Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2
Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.
Часапіс выходзіць раз у тры месяцы

Зьмест кніжкі 2 (11) „Калосься“

Белар. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 2 (11) 1937 г. Год III

У туманох вішнёвых

Ураклі, матуля, сына твайго людзі,
ураклі загоны і палі,
як ў зялёны кужаль убіралі грудзі
шэрыя бярозы, тапалі.

Ураклі і вочы сінія Краіны,
і кудлатай руні дываны, —
хтось рукой мазольнай сеючы закінуў
залатыя шолахі вясны.

Сяньня не памогуць лекі ад урокаў,
ні твае малітвы да зары, —
не засну, як даўна, зрэбнаю паўноччу,
сінякрылым рэхам у бары.

Нават пад курганам чуў-бы звон далёкі,
як напевы песьняў каласяць тугой,
як скрыпяць калёсы ў полі адзінока
поўныя сялянскаю бядой.

Вось спачну мо' трохі ў туманох вішнёвых
затапіўшы вочы мокрыя ў зару
і далей пайду я праз лясы, дубровы
журавініць песьняй Беларусь.

МАКСІМ ТАНК

Вільня, 6.IV.37.

Начамі чорнымі

1

Душу ў жабрачай торбе замыкаю,
жаданьні ўсе атручаны тугой.
Трывогу, радасьць, смутак і адчаі —
усё аддам Краіне маладой.

Зьбіраю словы чыстыя, як пэрлы,
і вострыя, як дзіды і мячы.
Пайду ў паход з дружынай гэтай вернай,
на бой — за справу гінучай душы.

На сьцежках — страхам ноч... і плачуць совы.
Балюча тнуць вятры адкрыты твар.
Са мной-жа моц зьнішчаючага слова,
і праўды дух, — і творчай песьні чар.

2

Начамі чорнымі па Краю,
з жабрачай торбай валакусь
і сьпячым вёскам сказы баю,
сьвітаньню песьнямі малюсь.

Адны завуць мяне прыблудай,
другія лірнікам сваім,
а я чакаю сьветлых цудаў,
ад яркіх зор і млечных ніў.

З зямлёй гутору на растаньні
вякамі топтаных дарог
і моцна веру у сьвітаньне,
у праўду сьветлых перамог.

Зямля ўздыхае так глыбока
і ветры словамі плывуць:
— на сьмерць вялі усіх прарокаў,
а дух і думы іх жывуць.

Душу ключамі не адчынеш,
ня зьнішчыш ножам і агнём
і толькі спадчынай пакінеш,
як спадкам браў яе з жыцьцём.

3

Па Краю цёмнымі начамі
брысьці асуджан лёсам я.
З жабрачай торбай за плячамі
між суму соннага жыцьця.

Тугу жаданьнем пагасіўшы,
агнём пявуча-звонкіх слоў,
як сьветач сэрца запаліўшы,
брыду да іншых берагоў.

Мінаю хаты, нівы, сёлы —
напевам сум іх калышу;
вучуся сум пяяць вясёла, —
вясёлай быць — вучу душу.

На гэту ціш начы нямую,
на гэты сон жывых кругом,
пасеяць чары слоў прабую, —
сваю душу ўдыхнуць жыцьцём.

Я веру зорам вельмі шчыра,
калі так гутару з сабой,
як птушка рушыўшы на вырай,
адна — між небам і зямлёй.

І зоры часта мне варожаць,
што сонца ёсьць! Што там відаць,
як дзень ўстае, як сон прыгожы,
што там агні, агні — гарацьі!

4

З жабрачай торбаю ня страшна,
хто вышаў ноччу у паход.
У сэрцы страхам — дзень ўчарашні,
а думы — зорны карагод.

У заўтра шлях... і марш упарта
шагоў нястрыманых зьвініць.
У небе зоры — сьветлай вартай
і вера ў дзень ў душы гарыць.

Краіна мар і сьветлых ценяў, —
якіх ня знойдзеш тут сьлядоў
ад мук, няволі і цярпеньняў
да чыну сьмелых бунтароў.

Шляхі варагаў і Баторых,
магілкі швэдаў і татар.
Ты шмат каму была падпорай —
шмат хто пляваў табе у твар.

А сяньня тулішся жабрачкай
у чыстым полі пад мяжой,
грызе душу агонь гарачы
і між сясьцёр — сташ чужой.

Твой верны сын абдзёрты й босы,
брыдзе ад вёскі да сяла,
і немач чорная у косы
каўтун нанова запляла.

5

Мяне хтось кінуў на выгнаньне,
начамі чорнымі блудзіць,
маліцца песьнямі сьвітаньню
і сьпячых волатаў будзіць.

Брыду сьлядамі каляінаў
па цёмнай спадчыне гадоў
і ліст спалоханай асіны
зьвініць над пусткаю палёў.

Аеры шэпчуцца з чаротам
над люстрам соннае ракі,
танцуюць цені карагодам,
дзе крыжам сходзяцца шляхі.

Галосіць каня над руччамі,
з балот крынічучай вады,
і ўюцца гады пад нагамі —
у багне топяцца сьляды.

А я брыду усьцяж наперад,
надзею ў сэрцы калышу,
дайсьці на той сьвятляны бераг,
ці згінуць ночай на крыжу.

6

Начамі чорнымі дарогай
таёмна бродзіць страх нямы
і як атрутаю трывогай
душу напоўнілі гады.

На сьвеце дзень зьмяняе вечар,
ўстае за ноччу раньне зноў,
і толькі тут начой адвечнай
лягла цямра на шыр палёў.

Начой нядоля над старонкай,
як мара чорная вісіць
і тут блудзіць, брысьці ў пацёмку
асуджан кожны, хто ня сьпіць.

Блудзіць з надзеяй на сьвітаньне
між сонных хат і сумных ніў,
брысьці туды да зорнай тайны,
дзе новы дзень ўстае ў вагні.

Народ мой сьпіць закляты Богам,
вартуе сьмерць яго душу,
ня раз рабілі тут Галгофу
і расьпіналі на крыжу.

Вякі, вякі — нямой Краіны
і палыновы, горкі лёс,
я вашу спадчыну пакінуў
і адракаюся ад сьлёз.

Начамі чорнымі упарта,
за крокам крок — цягну паход;
зарою сьвеціць — вера ў заўтра—
у раньня сьветлага прыход.

7

Заместа сьлёз — у торбе песьні,
сама рука шукае струн.
Брыду да сонечнай прадвесьні,
я — валачобнік і вяшчун.

Начамі чорнымі сягоньня
на сьцежках многа блудзіць нас.
Усе зыйдзёмся на загоне,
дзе зоры ткуць слуцкі пояс.

Няхай сатруць гады аблічча,
ня згасіць вольных дум жыцьцё
і на вялікай пераклічцы
мяне ня вылучыць ніхто.

З жабрачай торбаю зьяўлюся
з пацёмку пройдзеных дарог.
Душу і песьні — Беларусі,
а торбу кіну за парог.

Таболы, 28.III.37.

МІХАСЬ МАШАРА

Князёўна

У чыстым полі пад белай бярозаю
сонцам спаленаю, нецьвярозаю
тры дарожанькі стужкаю сьцеляцца
белым пылам уполудні беляцца.

А адна з іх ідзе у хваёвы бор,
а другая ідзе на зялёны лог,
на зялёны лог, у пахучы стог,
а астатняя йдзе да сівых вазёр,
да сівых вазёр, на князёвы двор.

Тэй дарогай брылі гусьляры-песьняры,
што сьпяваючы йдуць праз палі, праз бары.

У іх жоўтыя гусьлі кляновыя,
і іх струны зьвінячыя, сьпеўныя,
галасочкі разгульныя, пэўныя,
словы сэрцу блізкія, а новыя.

Засьпявайце-ж вы нам, гусьляры-песьняры,
аб вазёрах, аб княжым дубовым двары!

— Сталі ў белым пылу ...Надумляюцца...
струнаў лоўкай рукой дакранаюцца...

— „На крутым берагу, над імглою вазёр
а й харошы-ж быў той князёвы двор:

Сьцены моцныя ў князя, дубовыя,
стрэхі белыя, ўсё ясянёвыя,
ў птушкі, ў кветкі ўсяляк выразаныя,
густа вохрай рудой маляваныя.
Ў ганках княжых слупочкі тачоныя,
а замкі у дзьвярох залачоныя.
Так, багаты, харошы князёвы двор!
Дзе ні глянеш — парадак, дастатак, прастор...
Ўправа глянеш — зара разгараецца,
ўлева — месяц з расы абтрасаецца,
зьзяе-сьвеціць над нівамі яснымі
серабранымі й белымі пасмамі.
Азірнешся назад — ночка чорная,
ночка чорная, пушчы узгорныя.
Ўвышы — зоры ціхія, гаручыя
а ўнізе — дык вазёры бліскучыя.

Так, багаты й харошы князёвы двор!
Дзе ні глянеш — парадак, дастатак, прастор...
Аднаго ў ім няма — згоды, шчасьцейка,
што гняздо ўʼе пад стрэшкай, як ластаўка...

* * *

Злы й пануры ад раньня да вечара
ходзіць князь-пан і хмурыцца нечага,
ня вітаецца з жонкай прыгожаю,
(паміж імі маўчаньне варожае),
ня гуляе з дачушкай адзінаю
ані раньняй, ні позьняй гадзінаю.

Сумна й цяжка пад стольлю дубоваю.
Быццам нехта каменьні пудовыя
ўсім на плечы наклаў пазгінаныя.
Бы вароны на поле ўзаранае,
жалі-злыдні зьляцеліcь там нейкія
з горкай песьняй — адвечнай жалейкаю.

Красна, красна каліна ў садочку,
а красьней яе княжава дочка.
Па двары, па дубовым хадзіла, —
на ўвесь двор ясным сонцам сьвяціла.
Пад акенцам вясною гуляла, —
салавейкай малой сакатала,
заляцалася шэраю птушкай...
але князю ня люба дачушка!

Звалі князева дзецейка Славаю.
І сапраўды ўдалась яна слаўнаю:
белы тварык, сама сінявокая...
не дзяціныя вочы, глыбокія.
Часта Слава з пытаньнем нясказаным
на людзей ускідала... Ды зьвязаны
кожны быў у двары, быццам чарамі.
Моʼ й ці ведаў хто з чэлядзі старае,
чаму ў белых харомінах княжавых
кожны нудзіцца, быццам зьняважаны,
чаму князь па барох дзесь цягаецца,
ўсё палюе і дому чураецца,
а княгіня над тонкімі кроснамі
сьлёзы лье, быццам неба увосені?

Эх, дзяўчынкай ціхой, невясёлаю
вырастала дачушка князёвая.
Мела сэрца й галоўку гарачыя,
ня гуляла у гульні дзіцячыя.

А любіла яна сонца яснае,
сонца яснае, захады красныя,
бор сівы і зялёны, а ночамі
блеск вазёраў, зарой раззалочаных.

Там, адна над вірамі бяздоннымі
яна часта сядзела, бы сонная.
У ваду пазірала зялёную
з нейкай дзіўнай жудой забабоннаю.
І здавалася ёй, засыпаючы,
што вазёры з ёй быццам вітаюцца,
нешта шэпчуць чароўнае, дзіўнае,
залатое, як звон пераліўнае,
што бяруць яе хвалі разгульныя,
песьцяць, туляць павольную, люляюць...
І плыве яна з белаю пенаю
у краіну як сонца праменную.

Сумна, цяжка у князевых хорамах,
ды ідзе яшчэ горшае горанька.

Абярнулася гора бяздольнае
шэрай птушкай, зязюлькаю вольнаю,
сьлёзы, дзеткі яго — салавейкамі,
узьнялісь вятругой — сухавейкаю.

Прыляцелі ў князёвы садочак,
пад акенцам паселі ў радочак,
шэрым крыльлем балонкі разьбілі,
ды княгініну зорку згасілі...

* * *

Разгараецца вечар над хвойнікам...
Сьцеле ён залатыя настольнікі,
ручнікі, паясы жоўтатканыя
на вазёрныя хвалі рахманыя.
А ў двары плач стаіць, разьлягаецца,
бо княгіня з жыцьцём разлучаецца...

* * *

Эх, даўненька была яна хворая,
ўжо ня крыла палотны вузорамі.
Ткаці кінула кросны бялёвыя,
падтыкаці іх ніткай шаўковаю,
ахінуўшыся футрай баброваю
ўсё на сонцы сядзела, ды грэлася,
як калінавы цьвет забялелася.

І чаго толькі ёй не рабілі!
Ведзьмароў-знахароў прывадзілі,
а шапталі-ж яны, замаўлялі,
з трох крыніцаў ваду падавалі,

травы-зельле зьбіралі, сушылі,
тройчы ў ступах таўклі ды крышылі...
Дымам сінім курылі і горкім
ведзьмары-знахары і знахоркі...

Не далі сілы зельля пякучыя,
словы моцныя, словы гаручыя.
Відзяць знахары, — з сьмерцяй ня біціся, —
пачалі яны прочкі прасіціся.

Кажуць:—„едзьце па князя, канчаецца..."
(А пан-князь, ён ня дома, цягаецца
па лясох, ды палюе з грамадаю
верных слугаў вясёлай, зараднаю).

Дзе шукаць яго, князя? Гушчарамі
бор разлёгся кругом ды імшарамі...
Яшчэ нечысьць якая прывяжацца
проціў ночы, у лесе, ня кажачы...
Эх, па праўдзе, між князем — княгіняю
ўжо даўно няма згоды радзімае.
А няма паміж імі каханьніца, —
непатрэбна цяпер разьвітаньніца.

Гасьне яснае сонца над хвойнікам...
Залатым расшываным настольнікам
па пакоі княгініным сьцеліцца.
Над дубоваю лавай мяцеліцца
дробны пыл... і у косы зьвіваецца...
а княгіня з жыцьцём разлучаецца.

—„Шмат жыцьця я пры вас перамерыла",
(так прашчаецца з слугамі вернымі)
— „выбачайце-ж мне, людцы каханыя,
калі часам вас крыўдзіла, ганіла.
У далёкую йду я пуціначку.
Даглядайце-ж маю сірацiначку.

— Ой, дачушка мая, мая беленькая,
маё яблычка — недасьпелінка.
Я й насіла цябе й парадзіла,
ночкай цёмнай, асеньняй ня спала,
ўсё, дачушка, цябе калыхала,
сьвечку ярага воску паліла,
табе шчасьця і долі прасіла.
Колькі-ж сьлёзаў у цёмныя ночы
мае ясныя вылілі вочы,
як над хворай табою сядзела,
на гарачыя шчочкі глядзела.

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

валаскі залатыя пясьціла,
тваё дробнае целка туліла
ды сачыла ...ці сэрцайка б'ецца.
Ўсё, усё аддала-бы, здаецца,
каб магла ты галоўку падняці,
прытамней усьміхнуцца да маці..

Гасьне сонца, над лесам залоціцца...
Месяц белы ўстае над алешнікам...
Скора, дзеткі, й мая душа грэшная
сіняй зоркай у неба пакоціцца...
Ты яшчэ, мая дочка, маленькая,
ты ня знаеш жыцьця, залаценькая.

Ды каму-ж перад сьмерцяй адкрыюся?
Быццам крот я ў душы сваёй рыюся,
на сьвятло, так як крот пяскі ўзрытыя, —
выкідаю я дні пражытыя.

Ой, вы дні мае горкія, сумныя...
Ты, дачушка, дзіця неразумнае,
але знай, з чаго маці, канаючы,
табе, зорцы малой, спавядаецца:
гэта-ж, дзеткі, й маёй было згубаю —
— Ня йдзі замуж, ня йдзі за нялюбага!

Лепш з зялёнай вадой заручыцїся,
як з нялюбым чужынцам злучыцїся.
. . . .

Была некалі й я весялушкаю,
ў бацькі-маткі каханай дачушкаю.
Ані сьлёзаў ня знала, ні горачка,
быццам тая праменная зорачка:
ўстаўшы з сонцам вясьнянымі ранкамі,
зачынала я кросны вясьнянкамі,
з разьліўнымі, вясёлымі сьпеўкамі
ўлетку жала з служанкамі-дзеўкамі...
Ды, далі мяне замуж, дзяўчыначку
за чужога гасьця, на чужыначку.

Скора, дзеткі мае, казка кажацца,
ды ня скора жыцьцё наша вяжацца.

Вось, гадок ці мо' два патужыла я,
аж цябе дачакалася, мілая
(ды к каму ужо гора прылашчыцца —
у няшчасьце абернецца й шчасьцейка).

Твайму бацьку ўсё сына жадалася.
На'т імя яму ўжо выбіралася:

Усеславам меў звацца саколічак,
слаўным панам меў быць над ваколіцай.
Да мяне стаў ён, муж, ціхі, ласкавы,
ўсё, бывала, чырвонцамі бразгае.
Кажа: „сыну, насьледніку, спадчына"...
і сьмяецца... А сэрцайка матчына,
бы пад сонцам вясеньнім тапілася...
Аж тут, дочанька, ты нарадзілася...

Лёгка, дзеткі мае, казка кажацца,
ды ня лёгка жыцьцё наша вяжацца.

Вось тады я й пазнала, галубанька,
гнеў, пагарду й зьнявагу нялюбага.

Ня зірнуў на цябе ён, нявінную.
Зачыніўся ў пакоі гасьцінныя,
цэлы дзень там праседзіў, а ночаю
конна ў пушчу паехаў урочную.
Не хацела я, жалем зьвязаная,
пры сабе затрымаць некаханага.
Мала ўжо яго посьле і бачыла...
Вось... цябе гадавала і няньчыла...
Эх, пад князевай стольлю дубоваю
ўжо ніколі ня чулась здароваю,
а цяпер... і саўсім занядужала.
Паміраю ўдавою замужняю,
пакідаю цябе, сіраціначку,
бы у полі у чыстым каліначку.

Ломіць вецер каліначку, дзецейка,
яе сушыць гарачае лецейка,
пярунамі... б'юць буры грымотныя...
Дзюбам... птушкі... дзяўбуць пералётныя...

Ўсё ёй, беднай сіротанцы, згубаю...
Ня йдзі... дзеткі... ня йдзі... за нялюбага...

Так сказала княгіня й схінулася,
уздыхнула, уся здрыганулася...
З белай лавы высока засланае
адыйшла у дарогу нязнаную.

З'ехаў пан-князь з вясёлай дружынаю,
патужылі яны над княгіняю
й пахавалі яе за вазёрамі
ў чыстым полі пад небам, пад зорамі.
І курган над княгіняй насыпалі,
абсадзілі зялёнымі ліпамі.

Будуць ліпы вясной красаваці, —
аб дачушцы-сіротцы сьпяваці.

Будуць ліпы увосень жаўцеці, —
аб дачушцы-сіротцы шасьцеці,
а узімку, як сьцішацца ў белі, —
над магілкай галіны пасьцеляць.

Скора, людцы мае, казка кажацца,
ды ня скора жыцьцё наша вяжацца.

Ткаўшы ў хораме кросны бялёвыя,
аж і вырасла дочка князёвая.
Хоць сіроткай хавалася горкаю —
разгарэлася яснаю зоркаю.
Белай, кволай лілейкай-купаваю
па сьвятліцах па бацькавых плавае.

Пачаў князь-пан дачцы прыглядаціся,
на яе хараство дзіваваціся...
(— „Што харошая, справа ня новая.
Кроў мая-ж гэта, пэўне, князёвая“.)
Стаў хадзіць у сьвятліцу дзявочую,
слухаць гуд верацён пазалочаных,
стаў рабоце дзяўчат прыглядаціся,
жартаваці з князёўнай, сьмяяціся.
— „Эх, ня даў мне лёс сына — насьледніка,
але й ты у мяне не пасьледняя,
удалася ты бацьку князёўнаю,
белаліцай, высокаю, роўнаю.
Пашукаем багатага пана мы
за барамі для дочкі каханае.
Будзем, дзеткі, вясельле гуляці,
мёд чырвоны каўшамі стаўляці,
маем, маем мы чым пахваліціся,
будуць з нас яшчэ людзі дзівіціся!“

Гэтак кажа князь, ходзіць... спыняецца,
кроснаў белых, гладкіх датыкаецца.
А князёўна маўчыць, ня ўсьміхаецца,
ў вочы бацькавы дзіўна ўзіраецца.
Неяк жудасна князю на‘т зробіцца.
Неяк жонка-княгіня прыпомніцца.
Яе вочы спакойныя, сінія,
круглы тварык дзяцінны княгініны...
Замаўчыць ён, нярады, ды згорбіцца,
на дварэ ўжо затое усходзіцца,
як уніз зыйдзе ў службы дваровыя!
Толькі стукаюць боты казловыя!

Але так у жыцьці ўжо здараецца,
што бацькоўская воля спаўняецца.

Пад вясну князь сабраў слугаў-лёкаяў
і сабраўся ў дарогу далёкую.
Ад‘яжджаючы, пояс завязываў,
так дачцы паслухмянай наказываў:

— „Будзеш ты тут цяпер гаспадыняю
над людзьмі, над худобай, над скрынямі,
не хачу, каб з нас людзі сьмяяліся, —
а хачу каб нізенька схіляліся.
Дык вучыся, дачка, гаспадарыці,
можа скора замужжа нам здарыцца.“—

Разьвітаўся князь з дочкай нясьмелаю
і паехаў дарогаю белаю.
Ня было яго доўга... Ўжо ранкамі
ўсё паветра зьвінела вясьнянкамі,
ўжо рунелі палі й сіняй параю
сонна дыхалі пушчы прастарыя,
ўжо цьвілі вербалозы й ляшчыньнікі
над мутною вадою нізіннаю,
й цэлы дзень над зямелькаю шчыраю
гусі й качкі ляцелі із выраю...
Аж раз позным і месячным вечарам
у двары усхадзіліся нечага.
Шум узьняўся, агні запаліліся,
кажуць, — князь прыяжджае... Схапіліся
і жанкі і дачушка князёвая!
Чуе сэрцайка, будзе штось новае,
так і гнецца, як верба зламаная.
Эх ты долячка, доля нязнаная!
Ўжо ня раз ты з нас, людцаў, сьмяялася,
адмяніці жыцьцё абяцалася,
штосьці лепшае даці манілася.
Эх, накпілася посьле, накпілася...

* * *

Князь вярнуўся вясёлы, здаволены.
Уздыхнулі людцы паднявольныя:
рэдка відзелі ўсьмешку пагодную.
на твары князя (пана нягоднага).
Прывітаўся князь з дочкаю ласкава,
ды, каб доўга тут з ёю ня цацкацца, —
аб'явіў, што яна ўжо прысватана
за вялікага пана, багатага.

Скора, людцы мае, казка кажацца,
ды ня скора жыцьцё наша вяжацца.

Зацьвілі ў лесе дзічкі ружовыя, —
плача, жаліцца дочка князёвая.
Ў дзень прыгожы, адчаем атручаны
адбыліся у князя заручыны.

Малады, праўда, быў ваяводаю
і за княжай пасватаўся згодаю,
але сам быў... таўсты і расхрыстаны...
Яго вочы мутныя, нячыстыя
так князёўне ціхой прыглядаліся,
што яна ўся крывёй абліваласа.
Дык ці-ж дзіва, што ночкай маёваю
сьлёзна плача дачушка князёвая.
Так аднача ў жыцьці ўжо здараецца,
што бацькоўская воля спаўняецца.
Ў сянаваньне, вось неяк нядзелячкай,
пачалося у князя вясельлейка.

— Ўзьвейцесь ветры з-за пушчы сасновае,
— разьнясіце пясочкі жвіровыя,
— разбудзіце вы родную матачку,
— хай устане, хай прыдзе у хатачку
— на адзін, на кароткі часочак,
— аддаць замуж сіротаньку-дочку!

Ня ўздымаюцца з пушчаў і з нетраў
сухавейныя буйныя ветры,
не разносяць сыпучы пясочак
з над заплюшчаных матчыных вочак.

Ой, ня ўстане, ня ўстане матуля
на вясельныя песьні ды гулі,
ой ня прыйдзе дачку выпраўляці
на пасад... Не парадзіць дзіцяці
як з нялюбым, чужым, некаханым
заручацца на лёс той нязнаны.

Цісьне матку — сырая зямліца,
зелянее над ёю травіца,
ў вечнай цемры магільнае ночы
ўжо ня відзяць жыцьця яе вочы...
Зачынайце-ж вы, людцы, вясельлейка
княжай дочкі прыгожае, беленькай.

* * *

Ой відаць, ой відаці ад раніцы,
што сірочае йдзе баляваньніца...

Мо' у князя двары немяцёныя,
можа госьці ў яго засмучоныя,
мо' сталы у яго незасланыя,
мо' мяды залатыя ня п'яныя?

— Не, й сьвятліцы у князя мяцёныя,
ой, і госьці у князя вясёлыя.
Плача толькі, сьлязьмі заліваецца,
срэбнай рыбкай на лёдзе кідаецца
маладая дачушка князёвая,
заплятаючы косы шаўковыя.
Чуе Слава музыку вясельную,
чуе крыкі разгульныя, хмельныя,
відзіць вочы мутныя і п'яныя
ваяводы свайго некаханага...
Зараз прыйдуць лябёдачкі-жоначкі,
прыбяруць у шаўкі, у кароначкі,
возьмуць, возьмуць за рукі, за белыя,
павядуць няжывую, самлелую
да гасьцей у хароміны новыя,
ды пасадзяць на лавы дубовыя.
Побач сядзе з нявестаю збуджанай
ён, чырвоны, таўсты, ёй прысуджаны,
будзе „горка“ крычаць ...цалавацїся...

Ой, ляцець, ратавацца... Схавацїся
хоць куды: ці ў бары непраходныя,
ці ў дрыгву балацяную, зводную.
Ў сьвет жабрачкай сыйсьці абарванаю, —
бы далей ад яго, некаханага!

— „Помні, ягадка, дочка-галубанька,
ня йдзі замуж, ня йдзі за нялюбага“.

* * *

А быў вечар крывёю расплёсканы
над князёвай сялібай, над вёскаю,
над барамі сівымі і хмурнымі,
над вазёрнымі хвалямі бурнымі.
Бегла Слава рудымі пракосамі
ўніз, а вецер трапаў яе косамі,
цалаваў яе вочы мяцежныя,
слаў пад ногі трысьцё прыбярэжнае.
І спынілась князёўна над хвалямі...
Эх, адна з сваймі крыўдамі, жалямі
на ўсім сьвеце яна апынулася.
А ўсё матчына мова ёй чулася:
— „Ня йдзі замуж, дзіця, за нялюбага,
не на тое цябе я галубіла,

лепш з зялёнай вадой заручыціся,
як з нялюбым навекі злучыціся".

А вада сяньня ...б'ецца і пеніцца...
Дзе-ж князёўна спачне, дзе падзенецца?
Як вада, яна ўся ўсхваляваная.
Перад ёю — глыбіна нязнаная,
а за ёй — княжы двср над узгоркамі,
некаханы жаніх, доля горкая...

Азірнулася Слава... Раскінула
рукі шырака... Ў возера рынула,—
заручылася з хваляю чорнаю
ночкай цёмнай, вятранай, бяззорнаю...

* * *

І ляжыць яна там, знаць, шчасьлівая —
над ёй возера ходзіць шумлівае,
штось ёй шэпча чароўнае, дзіўнае,
залатое, як звон пераліўнае
Як дзіця, яе хвалі разгульныя
песьцяць, туляць павольную, люляюць,
засыпаюць пяскамі бялёнымі,
асакой заплятаюць зялёнаю...

Годзе-ж вам, гусьляры, хлопцы вольныя
сьмерць князёўны пяяці бяздольнае.

Ў чыстым полі пад белай бярозаю,
сонцам спаленаю, нецьвярозаю
тры дарожанькі стужкаю сьцеляцца,
белым пылам уполудні беляцца.
Йдзіце-ж, людцы, ураньні, увечары
ў сьвет шырокі пуцінай намечанай.
Грайце звонка у гусьлі кляновыя,
бійце ў струны зьвінячыя, сьпеўныя,
галасамі разгульнымі, пэўнымі
пейце песьні старыя і новыя.

Праз лагі, праз ніў'я разараныя,
йдзіце долі шукаці нязнанае!

1937.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

На ростані

1.

У гэты зорны вечар пяялі молада гукі аркестру. Клікалі кудысь — здабываць сьвет. У вокнах вялікай гімназіяльнай залі цьвілі халоднымі рожамі водблескі рэфлектара. А ў музыку ўпляталіся званочкі. З усіх лекцыяў сабраліся яны й весела разьзьвінеліся шумам маладых галасоў. Як-бы сьветлай раніцай траўнёвай гімназіяльны сторож у пустых калідорах выконваў на званкох нейкую вясёлую вясеньнюю мэлёдыю.

Замятухай ішоў вечар. Усьмешкі, пары, заля, вагні — усё плыло, рухалася, круцілася ў нейкім ап'яняючым шуме.

І нечага жаль было Ніне ў гэтай радасьці. Прыемна-больна мітусіліся ўспаміны. Імглістыя, і сонечныя, і маразяныя раніцы, калі сьпяшалася яна ў школу. Ступенькі гімназіяльных шырокіх сходаў спатыкалі яе, беглі й шуршэлі то жвірова, то шоўкава... Паўзы — калі прыемна пахлі й беласьнежна-ярка бялелі язьміны на гімназіяльным панадворку.

Вечар ішоў замятухай. А ад некаторых калегаў чуваць было хмелем, і погляды іх то завострана-калючыя, то расплыўчата-шырокія. І ў сьвятлеючай сіні вечару чуўся холад растаньня.

З вучыцялямі Ніна танцавала. І з калегамі. Уважна, сур'ёзна, з нейкім асаблівым мастацтвам ступала пружка, дробна, то плаўна кружылася матылём.

— Як-жа-ж там закон Бойль-Мар'ётта?

— Я... гм... яшчэ вучуся танцаваць...

Гукі сыпаліся вясеньнімі абрывамі, шумелі каласамі ў непагоду, перагукваліся зязюлькамі ў сасоньніку.

— Бывай, Гімназія!

У гэны зорны вечар Ніне апошні раз падалі калегі пальто. Жартавалі, сьмяяліся, абяцалі, што —

— Будзем пісаць!

— Яшчэ пабачымся!

— А ўлетку ровэрамі!

Сама ня ведала, ці радасна ёй, ці сумна. Здавалася, уцякла-б дый расплакалася. Здавалася, недзе крыўся на дне боль нявымоўны й туга сардэчная.

Зашпіляла пальто.

— А можа я, Ніначка?

— А можа я?

І сьмяяліся молада-весела.

У гэты зорны вечар закруціліся, замітульжылі вагні, і сходы, і твары і ўпалі недзе ў процьму, адплыла ў галубую даль рань маладых дзён. А яшчэ гучыць у вушшу пявучымі зовамі вальс, яшчэ мігаюць, здаецца, худыя, далікатныя плечыкі Ніны між параў пад ясна-сонечным сьвятлом лямпіёнаў.

2.

Праводзіў Ніну студэнт Сьцяпан Пракапеня. Але куды ісьці? Рана-рана прыймчыцца цягнік з даляў, прынясе ў места ружовы расьсьвет і забярэ Ніну ў родную вёску. Пагутарыць хочацца. Расьцьвілі ўжо каштаны ў садзе й прыемна-мядова расплываюцца над ракой.

Холадна ўсё-ж ноччу ў гарадзкім садзе. Селі на лаўцы. Сьцяпан абставіў каўнер плашча, зьвесіў нейк нязручна галаву, глядзеў у суценьне алеяў. Шкло ад акуляраў выглядала буйнай сьлязой, зьвісшай над вокам.

— Значыцца ты, Ніна, да хаты?

Сказаў, і неяк дзіўна загучэлі словы. Здавалася, гэта лісьці шапталі, ня ён. Было нешта яшчэ ў гэтых словах, было нейкае цяпло, нейкая ласка. — Гудзеў горад, недзе кіпела, бурліла жыцьцё, у гудках станцыйных, у далёкіх рэхах, у далятаючых хвалях шуму.

А Ніну чакаюць соткі, мо' тысячы шэрых дзён, поўных вытрываласьці, зацятасьці ў штодзеннасьці беспрасьветнай.

— Можа калі прыеду...

А цяпер на вёску едзе Ніна, у цішыню бязмоўную...

— Так, на вёсцы няцікава...

— Але можна жыць і працаваць. І трэба.

Вёска... Маленькія хаткі — грыбкі старыя. Цесна. Душна. Потна. Махорачны дым і кашаль. А Ніна ўжо ведае аб іншым жыцьці. Ужо іншы сьвет можа ўявіць. Чысты пакой. Ціша.

Ніна пальчыкам націскае электрычны гузік і ля ложка яе яркай півоніяй загараецца лямпа. Ніна ўстае. Падыходзіць да бібліятэчкі. Шукае кніжку. Раз яна бачыла ў дырэктара такі пакой. І застаўся ён каляровай фатаграфіяй у яе памяці.

— А я вось яшчэ пару гадкоў памучуся...

Сьцяпан дохтарам будзе. Будзе хворых лячыць. Ніна ўявіла сабе дохтарам Сьцяпана. У белым хвартусе, між белі шпітальнай, з акулярамі.

— Так, так, цяпер ня дыхайце.

Узьняла павекі і ў цемнаце Сьцяпан заўважыў, як-бы ў попеле блішчалі дзьве бледныя іскрачкі.

І йзноў ціха — маўкліва-маркотна.

І йзноў загаварылі.

Ніна! Хай ня сумуе. Праўда, цяжка цяпер. Але рабіць нешта можна. І гімназія — гэта закончаная асьвета. А вучыцца далей можна. Колькі, колькі людзей у Беларусі ня маюць гэтага, што Ніна. Інакш, глыбей, разумней жыць — гэта вялікі скарб. А магла-ж Ніна астацца на вёсцы й быць нявраматнай. Зрэштай... Цяпер ня так ужо й недаступны ўнівэрсытэт. Беларускі рух ажывіцца... А адпачыць — не зашкодзіць. Сабрацца з думкамі. А там відна будзе. Ён скончыць мэдыцыну. Будзе мець працу. Тады ён возьме Ніну і пойдуць яны разам у жыцьцё, будуць працаваць для народу.

Неяк нязручна пацалаваў яе. Ня так, як раней. Але ў душы яе было нешта чыста-крыштальнае, безгранічна-цёплае й незразумелае. Ішла яна як-бы бязвольна, апіраючыся на яго руку.

Пахлі каштаны.

3.

Весела

Сонца растапіла далі й яны асьляпляючы закурэлі. Аддаюцца выразна-абрывіста ў гушчарох захопліваючыя пераходы-рытмы цягніка. Бярозы, і сосны, і кусты — задымяцца, паплывуць зеленаватымі разрывамі. І вецер кудлачыць — разьвейвае дзявочыя валасы. Поле дыхае ў твар, і вецер лашчыцца ласкамі нязьведанымі.

А выхіліся з вакна — гудзіць поўным ходам цягнік. Моцна ўядаюцца колы ў рэйкі, пераклікаюцца рознымі бэмолямі, гулка грахочуць, грымяць. І ўсё павабка. І гэтая шыр палёў, і гэтыя хаткі і гайкі, што адплываюць у чысты, вясеньні гарызонт.

Хутка станцыя.

Усё знаёма. Глушэй і глушэй сьпеў жалеза. Павольным вальсам круцяцца рэдкія сосны. На спатканьне выпаўзаюць зусюль рэйкі й плаўна праводзяць цягнік да станцыі. Аддае белым парам. З-за агарожы відаць сіратлівыя домікі, фурманкі. І там напэўна іх Гняды.

Калючым ад вусоў пацалункам спаткаў бацька.

— Прыехала, знача?

— Скончыла ўжо.. Цяпер з вамі буду... Вось і польная дарога. Так прывольна і ціхамірна на душы пасьля гарадзкога шуму. Як-бы ўсё — і школа, і экзаміны, і места, і Сьцяпан — гэта быў нейкі сон.

— Змучылася, відаць, — і бацька адвярнуўся да Ніны.

— Ноо! —

Скрыпелі колы ў выбоінах, гладка каціліся па роўным пясочку, цешылі сэрца з блізкім спатканьнем. І так хутка адзьвінелі пявучыя рэйкі й праймчаліся малінава-сонечныя далі.

4.

Хвалі калосьсяў то прыплываюць, то йзноў адплываюць ад узьмежжаў у небасхіл. І прыемны іх бунтарны прыбой. Ільсьніць — пераліваецца шоўкам паветра ад сьпекі. Набягае пявучы шум. Бягуць каласы ў небасхіл. Зямля гарыць. Душна. Сьпякотна

Але прайшлі летнія буры.

І глуха зашуршалі сярпы. Падалі каласы. Ніна ўся ў сонцы. Ідзе па ўзьмежку, а поле далёка разаслалася абрусом многатканым, пералівамі фіялету, і золата, і зелені. Дзе ні глянь — людзі. Перавяслы падымаюцца ў руках, раскідаюцца буйныя каласы пад сярпом. Ніна ваду нясе. Там — далёка — за шашой

маці й сястра. А сярпы шуршаць, рытмічна зразаюць калосьсе.

— Ох, добра, Ніна, што вады прынясла — маці з смагай прыпала да бунькі. Абцёрла рукой пот, перавязала хустку, паглядзела навокал. Гучыць поле тысячнымі шопатамі, пяе. А сястрыца далей ідзе, сярпом займае.

— Адпачыньце, мама.

І блішчыць у руках серп — паўзе вужакай у постаць жытнюю.

Песьня падала птушкай над полем, білася крыльлямі, а пасьля йзноў зьвінела. Як-бы вось на пераменцы сабраліся дзяўчаткі — гімназісткі, запяялі — успомнілі пра вёску родную, жніво беларускае, жнеяк вясковых...

Узьвілася песьня высока, высока, замёрла, млеючы, у гэтай вышыні нябеснай, над вёскамі сталетнімі, абарвалася, упала — і загаласіла, надрываючыся жалем, заліваючыся сьлязьмі, стогнучы болем—калыхалася над збожжам і гублялася дзесь у бязьмежжах нізінных ..

Сьпека. Сярпы займаюць, — шалясьцяць сярпы. Далей пераступаюць ногі. Залацяцца перавяслы.

А вечарамі квакалі жабы, як-бы нехта ў іржавым балоце мянціў касу.

5.

Чакала Ніна яго. Доўга, цярпліва, дзявочым сэрцам. А тымчасам плылі дні, адцьвіталі ў лагох. У верасьнёвыя ночы падалі зоркі. Холадна — сумна імгліліся раніцы на іржышчах. Жаўцелі лісты. Нячутна наплывала восень над полем, дзе бабы капалі бульбу.

У хаце зрабіла Ніна парадак. У бакоўцы прарэзалі большае вакно. Тут жыла Ніна з сястрой. Ніна была тут гаспадыняй. Маленькую шафку на кнігі зрабіў ёй вясковы столяр Апанас. У шафцы кнігі разставіла Ніна і любіла вольным часам узяць томік і разгарнуць знаёмыя карткі. Пакойчык выглядаў прыветна. Праўда, бэлькі зьвісалі, столь за нізкая, цеснавата, але не ўпяршыню тут Ніна была. На сьценах павесіла Ніна макаткі з валькамі. Пайшла гутарка па вёсцы пра новыя парадкі ў Сымонавай хаце. Першая пабачыла гэтыя дзівы Маланьня, суседка Сымонава. Прыйшла да паненак і быстрым вокам сфатаграфавала найменшыя ператасоўкі ў хаце. І нават шчотачку да зубоў заўважыла. А хутка паваліла вёска да Сымона. Прыдзе той, прыдзе другі, пасуседзку пагаворыць, пакурыць, а няўпрыцям і ў бакоўку зірне.

Зьбіралася часта моладзь у Ніны. У нядзельку, ці ў сьвята. А сталяр Апанас часьценька заходзіў. Работы ў яго мала, а кніжкі ён чытаць умеў.

— Цікавая ксёнжка — гаварыў ён.

— А можа-б так штось камічнае — я надта жарты ўсякія люблю.

З Апанасам любіла Ніна гаварыць. Аказалася, ён нават вершыкі сьмяхотныя пачаў пісаць. Толькі не асабліва ўдаваліся яму яны. Доўга выясьняла Ніна, як павінен ён пісаць. Чытала іншыя вершы, параўноўвала. Часта сядзелі вечарам і чыталі. Пачала Ніна Апанасу аб коопэрацыі расказываць. Зацікавіўся вельмі.

— А ці мы можам залажыць коопэратыў?

— Можам. Ясна, што можам. Але трэба раней падгатаваць грунт. Трэба моладзь усьведаміць. На старых трудна лічыць, але моладзь, калі возьмецца, зможа залажыць.

Прыйшоў другім разам з Апапасам Кульгавы Рыгор. Меў ён невялічкую гаспадарку, а быў вельмі грамадзкім чалавекам.

Пачалі абмяркоўваць, як да справы прыступіць.

— Вёска нашая блізка ад станцыі — казала Ніна — можна тавар прывозіць, а з суседніх вёсак таксама купляць будуць... Трэба склікаць сход закладчыкаў...

Апанас хадзіў ад хаты да хаты й гаварыў пра коопэратыў. Ён уваходзіў у хату і голасна абвяшчаў:

— Коопэратыў адчыняем!

Усе дзівіліся й пачыналася гутарка. Апанас пачынаў выкладаць сваю веду:

— Вось ты, Мікіта, гаспадар, а ня ведаеш, што цябе ашуківаюць. Едзеш ты ў мястэчка, купляеш, напрыклад, цьвякі. Простая рэч. Ну, і колькі-ж ты плаціш за кілё? —

Старыя недаверчыва адносіліся да справы.

— Эх, ты, мудрая галава — казаў Мікіта — што там многа гаварыць, — калі такі Абрам зачыняць хоча сваю краму, то што мы тут зробім.

— Яно — то, вядома, — уваходзіў нехта ў гутарку — каб так было, як ты гаворыш, то добра было б.

6.

Гапоўнае было зроблена. Вёска загаварыла аб коопэратыве. Розна гаварылі. Адны меркавалі, што Сымонава дачка краму залажыць хоча. А іншыя казалі, што Рыгор Кульгавы тут нейкія штучкі строіць. Але на сходзе справа выясьнілася. Сабраліся ў школе старыя й маладыя, і Ніна доўга тлумачыла, што такое коопэрацыя. Так, ангельскія работнікі можа й добра рабілі, але-ж тут гаспадары. І на гэта адказала Ніна.

— Дык хто-ж запісваецца ў сябры коопэратыву? — спыталася й чакала з трывогай адказу ад грамады.

Першы запісаўся Апанас, пасьля Рыгор Кульгавы, Нінін бацька, некалькі хлопцаў, некалькі сялян, падбухтораных Рыгорам і Сымонам. Набралася чалавек дваццаць. Ніну выбралі старшынёй ураду, а Рыгор Кульгавы ўзяўся вазіць тавар. Апанас аддаў бакоўку ў сваей хаце пад краму. Калі выяжджаў Рыгор першы раз на станцыю ў гуртоўню, усе старыя гаспадары высыпалі з хат.

— Па коопэратыў паехаў — жартавалі. І прадстаўлялі

коопэратыў, як нейкі вулей. Але ўсё-ж і цікава было ўсім гэтае ажыўленьне.

— Ну, пабачым, што з гэтага выйдзе — казаў Мікіта.

Сыпнуў дождж. Дымкай зацягнула сьвет.

— Ого, яго добра вецер натрэбле.

— Ну, але добра яшчэ, што ў плечы вецер.

— Э... неяк заедзе.

І паволі разыйшліся ўсе па хатах.

Спачатку праца ня клеілася. На паліцах — пуста. Але вёска пабачыла, што выгада вялікая мець на месцы краму. Балота, гразь — куды там ехаць у места. А тут пад бокам і газа, і сернікі, і махорка. Дый у краме неяк весела пасядзець, пагутарыць. І газэтка паявілася. Апанас чытае, што ў Гішпаніі, што ў Саветах, што ў Польшчы дзеецца. А галоўнае, што газэтка — пасвойму, пабеларуску пісаная. Пачала вёска на коопэратыў інакш глядзець. А тавар значна таней, чым у мястэчку. Весялей езьдзіў Рыгор Кульгавы на станцыю. Падсядзе хто па дарозе. Закурэць — пагавораць. А позным вечарам Апанас раскладаў з Нінай тавары, расцэньваў, упісываў у кнігу.

Разросься коопэратыў. За зіму зьвязьлі дрэва з пушчы. На выплату купілі ў лясьніцтве. А вясной — застукалі сякеры. Рос новы дом. Ясьнеў сьвежай смалой здалёк. Ніна езьдзіла ў старраства, пісала ў Саюз коопэратываў, увесь вольны час пасьвячала грамадзкай справе. Прыяжджаў люстратар і вельмі спадабаўся сялянам. Гаварыў пабеларуску, заахвочваў усіх уступаць у коопэратыў.

Ажыла вёска.

7.

Сьцяпан пісаў рэдка. Пошту прывозіў солтыс з мястэчка. Калі было нешта Ніне, солтыс заходзіў у Сымонаву хату, закурываў скрутку з махоркі й дзяліўся ўражаньнямі з мястэчка. А пасьле выймаў з кішэні старога фрэнча газэту ці ліст і казаў:

— А гэта, мусіць, паненцы ўсё шлюць.

— А няўжо-ж — ківаў галавой стары Сымон—яна-ж у мяне вучоная. Мала хто ёй піша. —

Ніна пасьле атрыманьня карэспандэнцыі выходзіла ў бакоўку й, калі быў ліст ад Сьцяпана, з трывогай, любоўна разрывала канвэрт і доўга, некалькі разоў чытала, узважвала кожнае слоўка, старалася ўсяго яго зразумець. А пасьле неспакойныя думкі муцілі яе спакой, і лятуценьні плылі нястрымана, абразы за абразамі.

Ніна з прыемнасьцю тады чытала вершы. Даставала яна томік „Калосься" і западалі ёй у сэрца строфкі:

„Нярaз здавалася Тацяне: —
ідзе хтось ціха ля паркану,
на'т крокі чуліся ля хаты.
А можа не?

З вярбой кудлатай
абняўся месяц над затокай...
. . . .
Што-ж ня сьпіцца, Тацяна?
Можа ноч без зарніц,
ноч вясеньняя,
дажджом чорным шуміць
за парканам?"...
. . . .

І здавалася Ніне, што прыдзе ён аднойчы вечарам, адведае яе, супакоіць. А часам муціліся думкі й згадвала яна будучыню: уяўляла супольнае жыцьцё й працу. Ніна заўважала, як часта забываецца яна й доўгія хвіліны як-бы сьніць і жыве ў нейкім нерэальным сьвеце. Закрадаўся сум у дзявочае сэрца. Не хацелася нічога, толькі плыць-калыхацца ў лятуценьнях, бяз дум, у паўсьне. Можа, каб засталася ў Вільні, інакш плыло-б жыцьцё. Былі-б яны разам. І не таміла-б туга вясковая. Там усё-ж рух, беларуская інтэлігенцыя.

І ізноў перачытывала Ніна яго лісты, і вера ў яго йзноў радавала сэрца. Пісала Ніна днеўнічак. От, проста ад нуды. Каб не загубіцца ў глушы з сваімі думкамі. Ёй самой здавалася гэта рамантыкай, нечым перастарэлым, інстытуцкім. Але любіла Ніна заглянуць у брульёнік, дапісаць нешта, хавала старанна яго ў кошык пад ложкам, каб ня трапіўся каму ў рукі. У адчыненае вакно льлецца пах мяты.

Канчаецца ліпнёвы дзень. Сонца сядае за полем.

— — — — — — — — — — — — — — —

„Сьніўся мне ўсю ноч Сьцяпанка, мой любы, каханы. Прачнулася я й яшчэ памятую, як клікала яго... Не хацелася мне ўставаць, бо ўчора позна лягла. У коопэратыве часам аж чырванела за сваю няўважнасьць. Часам Апанас некалькі разоў зьвяртаўся, пакуль ачнулася з задумы"..

— — — — — — — — — — — — — — —

Праз разваленыя платы й плятні здаецца, што сонца загразла недзе ў палескім балоце.

— — — — — — — — — — — — — — —

„Скончыўшы працу ў полі, вярталася праз гарод да хаты. Ішла між кустоў агрэсту. Спынілася. Знайду агрэст, ці не? Знайду — значыцца будзе ліст ад яго. Глянула на адзін пучок, другі, трэці і знайшла сьпелае, чырвонае зярно. Якая я сьмешная й наіўная!"...

— — — — — — — — — — — — — — —

На вуліцы курыць малінавы пыл. Гоняць каровы.

— Ку-ды! — даносіцца крык пастуха Піліпа. Раздаецца ляскaньне пугі.

— От, халера якая дурная!

— — — — — — — — — — — — — — —

„За дваццаць дзесяць. Ноч ужо ў вёсцы. Што цяпер робіць Сьцёпчык? Як хутка ляціць час, здаецца ня так даўно пры-

ехала, а ўжо другі год! Нейкая зрабілася я цяпер неспакойная, усё мяне трывожыць, нечага баюся, як-бы якое няшчасьце ня здарылася. Усё-ж Сьцяпан бязлітасны, ужо месяц ня маю вестачкі ад яго. А можа заняты? Экзаміны...“

— — — — — — — — — — — — — — — —

— Лыска! Лыска! — кліча маці карову.

— Быць! Быць! Быць!

— А ну, у хлеў!

— — — — — — — — — — — — — — — —

„Антон Маланін — цікавы тып. Каб умела пісаць, можна было-б выкарыстаць. Начамі ён, відаць, ня сьпіць. Усё кашляе. Пэўне, сухоты. Выйшла ўчора з хаты й доўга стаяла ля плоту.

— Што-ж вы дзядзька ня сьпіце? — спыталася.

Настарожана падыйшоў Антон да плоту.

— А, гэта вы — а я, дальбо, не пазнаў — цьфу ты!—спалохаўся.—Антон прывітаўся са мной сваёй засушанай рукой і пачаў расказываць мне, як у яго абкалацілі йгрушы ў прошлым тыдні“.

— — — — — — — — — — — — — — — —

Сонца ўжо зайшло. На двары шамраць і бегаюць дзеці. З сенцаў пахне сьвежым малаком.

— — — — — — — — — — — — — — — —

„Сягоньня мае імяніны. Я прачнулася рана. Гляджу — а на стале прыгожы букет кветак. Сястра сказала, што гэта вучыцель прыслаў. Хай ён што хоча шле, а я Сьцёпку кахаю“...

— — — — — — — — — — — — — — — —

„Учора з вучыцелем езьдзіла ў мястэчка ў кіна. Ішоў фільм „Апошні загад“. Прабаваў рассыпацца ў камплімэнтах, я сказала адразу, што ўжо кахаю. Цікавіўся — хто ён?“...

— — — — — — — — — — — — — — — —

„Вучыцель падтрымлівае наш коопэратыў. Усё-ж ён добры чалавек“ ..

— — — — — — — — — — — — — — — —

8.

Схудала Ніна. Вочы ўпалі й мізэрны твар пазіраў на яе ў люстэрку. Бледна ўсьміхалася. У хаце не заўважалі зьмены. Але Ніна чула, што траціць яна красу дзявочую. Панурыя і павольныя думкі прыходзілі васеньнімі днямі. Думкі нейкія неўпарадкаваныя. Хацелася сабраць усё перажытае разам. Выходзіла Ніна вечарам на вуліцу й паглядала сумна ў васеньнюю муць. Ільсьніла гразкая каляіна ад месяца, што коўзаўся ў разрывах алавяных хмар. У душы — нявыразна — мутна. Ня так, як калісь, — калі вучаніцай яшчэ радасна ехала ў Вільню, калі кожны гудок суліў радасьць спатканьня з дзяўчатамі загарэлымі, сябрамі. Часта тады Ніна выходзіла на вясковую вуліцу й выабражала свой ад'езд.

Здаецца, сядзіць ужо ў цягніку. Па абодвух бакох — полкі. Цягнік ідзе. Усё ўцякае ў адваротны бок. Паволі клеяцца вочы і яна заглыбляецца ў сон...

Шэрыя хаты сьпяць ужо моцным сном. Толькі сабака недзе адзываецца з канца вёскі, з-за загарадзяў, а хутка да яго прылучаецца другі. Гэты брэх пераходзіць у завываньне й яшчэ сумней Ніне.

Міналі хвіліны, цягнуліся доўгай ніткай думак і нейкага тупога болю. „Ужо, мабыць, пасьля поўначы“... Нідзе ня відаць агню. І так захацелася Ніне пабачыць чалавека, пагаварыць, хоць аб чым небудзь, хоць паглядзець каму ў вакно, каб ня было так цяжка на душы. Ніна чула сваю адзіноту, чула, што няма з кім падзяліцца сваім настроем. І было яшчэ цяжэй. Паволі ішла ў бок могілак, за вёску. Цёмныя платы здалёк выглядалі, як кусты, і, здавалася, там нехта прытаіўся, каб зараз выскачыць і кінуцца на яе.

Столькі разоў праходзіла сюдэю, і ўдзень, і ўночы, а цяпер вось нейкі страх паволі закрадаўся ў душу й рабіў трывожным кожны шаг, бунтаваў думкі. Ніна мусіла некалькі разоў супакойваць сябе, называла сябе пугапам і рабіла вялікі высілак, каб не вяртацца назад. З-за платоў цямнелі крыжы, вартаўнікі гэтага царства нябожчыкаў. Няраз здавалася, калі пад ветрам скрыпелі дрэвы, што гэта з дамавін устаюць нябожчыкі й цьвякі заржавелыя скрыпяць ад іх натугі. Ніна пераскочыла праз плот і пайшла заросшай сьцежкай па могільніку. Вось магілы людзей, што калісь жылі, кахалі, думалі, працавалі. Старая, прадвечная Беларусь. Вось тут недзе ляжыць вісельнік, якім пужалі яе, малую. Крыжы й крыжы між кустоў, дрэваў. Плач, колькі хочаш, вырві сэрца з грудзей — не падымеш іх да жыцьця — разважала Ніна. А калісь і я буду там, пад зямлёй. Стала ля нейкага крыжа. Хто тут ляжыць? Вось яна, Ніна, стаіць над ім, ня існуючым, і думае, у ёй цыркулюе кроў, расшыраюцца лёгкія. Як дзіўна! Прыпамятавала Ніна, як звальвалі на могілкі памёршых ад тыфусу ўначы й неадзетых, як хто быў, скідалі недзе ў яму ля поля. Яны ўначы насілі жыта ў хлеў (клуні яшчэ ня было). Ішла назад. Стаяла ізноў ля хаты. А з двара суседзкага чуўся кашаль сухотніка — Антона.

9.

Плылі манатонна дні У коопэратыве вывесілі плякат: „Гарэлка—наш вораг!“ Апанаса пабілі на Вялікдзень п'яныя хлопцы.

10.

На палескіх балотах распускаюцца цяпер у шэрай, ціхай імгле белыя лілеі.

А Вільня спаткала Ніну шумам і грукатам.

Затрымалася ў знаёмай студэнткі.

— Як-жаж там на вёсцы?

— От, нічога цікавага.

І ў гэтых пару словах зьмясьцілася ўся горыч і адзінота.

Ніна даведалася, што Сьцяпан Пракапеня ўжо дохтар і жыве на прадмесьці. Пайшла.

Галава цягне ўперад, а ногі — ўзад! Уа! А яшчэ які кавалак! Ну, і гара... Маглі-б, урэшце, зрэзаць — лягчэй было-б хадзіць.

Адвыкла Ніна ад места. Выцерла хустачкай пот з твару — палягчэла. Падкінула зручней пад руку партфэль. Прыпякала вясеньняе сонца. Паволі паўзла гара ўніз. Выраслі новыя дамы, высоўваліся парадкі, брамы, пераміргіваліся сонцам вітрыны, праміналіся людзі. Усё неяк зьбівалася кучай гэомэтрычных фігур у вачох Ніны.

Толькі далей, на прадмесьці, дзе пачалі распрастоўвацца платы, патыхнула сьвежым красавіковым ветрыкам. Сонца песьціць твар, вехаціць у шыбах хусткамі сьветла-белымі. І ў нейкай сэкундзе зазваніла Ніна ў вялікія дзьверы, дзе вісела візытка: „д-р Сьцяпан Пракапеня". Адчыніла нейкая жанчына.

— Ці дохтар... дома?

Глянула на Ніну. Страшная яна, схудалая. Пальто ня моднае. Вось, звычайнае пальто.

— Дома — і жанчына паказала рукой пакой Сьцяпана.

Пастукала. Пачуўся нейкі шорах і шопат.

— Зараз, зараз! — голас яго той самы, толькі здаецца, больш мужчынскі, з нейкім нізкім адценкам.

Што там?

Сэрца білася. Яна — уся яго! Прыйшла яна з далі вяскова́й, з імглы шэрых дзён — расказаць яму, як ёй цяжка, як чарнее васеньнім кустом яе жыцьцё.

Зьдзівілася.

З пакою выйшла нейкая высокая, стройная паненка. Заўважыла, як мігнула яна ў бок Пракапені й хутка адчыніла знаёмы, відаць, ангельскі замок. У прамежку дзьвераў зірнула на Ніну.

— Сьцёпа!

Пракапеня шырака раскрыў вочы. Прад ім стаяла схудалая дзяўчына, з загарэлым павясковаму тварам. Няўжо гэта Ніна? Зьмяшаўся й спалохаўся.

Ня ведаў, як прыняць. Пацалаваў. Але пачула нешта халоднае ў ім. Ветліва рухам рукі запрапанаваў сесьці. Замітусіўся. Села ў крэсла. Чыста й прытульна ў яго.

— Ах, як прыемна, як прыемна, столькі гадоў!.. Ах, як гэта? Я й неспадзяваўся. А ў ваччу ў Ніны стаяла тая высокая, гнуткая паненка, што міргнула нэўхопна Сьцяпану. Але што-ж? Можа гэта так нехта... Ніна маўчала. Чакала ласкі, чакала цёплых словаў. А Пракапеня белай хустачкай праціраў акуляры й, гледзячы на Ніну, гаварыў і гаварыў.

— Так... А ў нас няцікава цяпер.

Пачуцьцё расчараваньня расло ў Сьцяпана. Няўжо Ніна так зьмянілася?

— Слаба йдзе праца. Няма ўласьціва нічога. Адна газэта толькі выходзіць...

Глядзелі на сябе й нейкімі чужымі гукамі спатыкаліся іх словы. У паўзах, між словамі, усплывалі Пракапені ўражаньні-успаміны аб тэй пухкай, поўнай, цьвітучай папярэдніцы Ніны.

— Бачыш — цяпер наагул цяжка. Крызіс. Пракапеня прайшоўся ўзад і ўперад.

На руцэ яшчэ чуўся усьціск жорсткае далані.

— Зьвязаць жыцьцё ня штука, бачыш, але-ж як жыць? Трэба абстаноўкі..

А перад хвілінай дакранаўся Пракапеня да шоўкавага цела, гладкае, сьвежае скуры дзявочае, упіваўся відам перагібаў стройных.

—Я яшчэ ўласьціва ня маю сталага месца. Што далей будзе —ня ведаю. Але ўсё гэта была мана. Сам ня верыў у свае словы. Нешта карціла Пракапеню хутчэй разьвязацца з гэтым. Але нельга было адразу. Патрэбна была ўпэўненасьць, што Ніна ня крыўдзіцца.

Што-ж было між імі?—Проста — юнацкая рамантыка.

Але не пачуў, як зрывалася й падала сэрца Ніны, як білася падстрэленай птушкай. Спакойна сказала яна, што — не, я так. Як-жа-ж у цябе праца. Пабачыла, як прыемна стала яму. Не, ніякага жалю ня чуе яна. Так, толькі нейкі тупы, незразумелы боль... Толькі на тэй лаўцы ў садзе, якую яна знайшла, кружыліся роем зоркі й падалі за цёмную заслону дрэваў.

М. ДАЛЬНЫ

Нарач
(Частка шостая)

1

Жытам дарогі ручнік
сьцелецца ў даль пад гару,
толькі гарачы ім пот
з твару свайго не сатрэш...
Хочыш, ...
ціха абняць Беларусь,
выпіць вачыма усход,
шолах разбуджаных меж.

Роўна эскорта ідзе...

. . . .

Можа успомніш калі:
шолах разсееных зор,
песьню і шум трысьнікоў,
цені вячэрнія дрэў;
можа успомніш зару,
кагаркі з сініх азёр,
нейчы разьвеены сьмех,
родны далёкі напеў.

Пэўна успомніш: чаму
з доўгіх этапных дарог
не спрабаваў уцякаць
ў цёмны нахмараны лес?
Ведай: ніколі, мой брат,
ў шэрых вастрожных мурох
ад успамінаў і дум
гэтых нідзе не ўцячэш!

Месяцы выткуць гады,
на валасох сівы сьнег,
як на сасьне маладой
засерабрыцца ў мароз.
Толькі ўсё думы твае
будуць блудзіць паміж стрэх
там, дзе вазёры і сінь,
там, дзе нядоля палос...

Золатам жыта цьвіце.

. . . .

Эх вы, дарогі жыцьця,
што там, за вамі ў далі?!.

Доўга зязюля ў бары
звонка кідала „ку-ку“,
ціха у восень грудзей
сыпала шолах калін.

Пыльнай дарогі струну
дрэвамі лес абарваў,
хмарай сасоньніку зьвіс,
шоўкам бяроз і асін.
Пахне лясной цішыной.
Сіні ягодніку стаў,
плямамі сонца расцьвіў
ў зелені соннай малін

Ціха эскорта ідзе...
Ў летні і сонечны дзень
не разьвітаўшыся нат
цяжка блізкіх пакідаць.
Як над вазёрамі ноч
сіні расплёскае цень, —
доўга вячэрняй зарой
будзе хтось сумаваць...

2

Прахор

Што, пан, далёка да вёскі?

Вартаўнік

Два ці мо тры кілямэтры...

Прахор

Сонца распаленым воскам —
паліць — гарачым паветрам.
Хочыцца піць..

Грышка

Неяк сумна
сяньня пляцешся, таварыш!
Хаты рыбацкія, гумны,
можа сям'ю ўспамінаеш?..
Дзесь засталіся далёка... —

Ціха пляцецца эскорта.
Цені ад соснаў высокіх
сьцеляцца сеткай падзёртай. —

Песьню адну я успомніў,
з дзён перажытых, гаротных,

пеў яе неяк з над Нёмну
ў цэлі суседняй работнік.
Путы раскуўшы, з пад стражы,
ў тайгу сыбірскую, ў поле
вырваўся з катаргі вязень,
вырваўся, чуеш, на волю...

Прахор

Чуў, як калісьці, пра гэта...

Змоўклі.
Адны успаміны
звоняць між струн каляінаў
мокрай расой самацьветаў.
Толькі спаткаўшыся рукі,
. . . . сказалі,
што дзесь, пад сонечным лукам,
дрэмяць вазёрныя хвалі.
І мо' пад шопат іх сіні,
аж да вячэрняй зарніцы,
погляд сірот і дзяўчыны
дзесь над палямі імгліцца...

Добра... што будзе дык будзе...
. . . .

Грышка

Разам... глядзі, не марудзіць...
посьле з дарогі... ў гушчары.
Ў лесе, як рыба у тоні
можна схавацца далёка...
Нат і густой падвалокай.
ў рукі свае не загоняць

Ельнік зялёны і гонкі
плямамі цені раскінуў;
хмарацца ў небе сасонкі,
хмарацца лісьцем асіны.
Эх, што задумаўся, стражнік?
Не прыглядайся гушчарам!
Позна схапіўся за браўнінг —
. . . .

Ў лес у зялёныя нетры!
Там дзе бярэзьніку выступ,
вострай сякерай ў паветра
гулка урэзаўся выстрал.
Раз і другі праграмела
рэха адбіўшыся звонка;

шумна цяцера ўзьляцела,
крыкнула спуджана сойка...
— Стой!!!
Стой!!.
Стой!..—голас пагоні
крыльлямі хрыпла
залопаў
там, дзе імшарны сасоньнік
крые зьвярыныя тропы.
Нехта ўцякаючы кроў'ю,
быццам-бы лісьцем кастрычнік,
на курганоў узгало'я
пырснуў на сіні
п'янічнік.

3

Часамі
празьвініць калёсаў лоскат.
Расьце імглы вячэрняе мурог.
Глядзіць тужліва стрэхамі ў даль вёска
на крыжаваньні калян дарог.

Тацяна

Чаму вярнуліся
з пустымі вы
рукамі?..

Першы рыбак

Зрабілі ўсё пад сілу, што было.
Але. . . . .
. . . .
Табе радзіцца-б рыбаком:
дзяцюцкі маеш нораў...
Чакай!..
. . . .

Другі рыбак

Цішэй! ідзе Іван...

Іван

Ну што-ж, суседзі,
добры вечар!..
Відаць з бяды забыліся і слоў...

Трэці рыбак

Ідзі сваей дарогай, чалавеча,
начлегу не знайдзеш ты больш у рыбакоў.

І в а н

Тацяна! і ты?..
Вас ашукаў хтось хітры!
І вы паверылі.
Ха — ха — ха!
Вы?..

Ч а ц ь в е р т ы р ы б а к

Пакінь сьмяяцца!
а то закончыш прыкра, —
каб не замёў дно тоні чубам галавы!...

П е р ш ы р ы б а к

Ідзі... пакінь...
Яшчэ так ня было на сьвеце,
каб Юда
кончыў
як чалавек жыцьцё...
Як цень худая слава папляцецца
далей шмат за вазёры...
Кожнае дзіцё
цябе спаткаўшы пальцам будзе торкаць,
а посьле выкіне цябе і панскі бот.
Няраз прысьніцца мо' табе аборка
і дзесь, на выгане, стары, надгніўшы плот...
Яшчэ пазнаеш ты агонь сірочых сьлёзаў, —
як сон яны твой спапяляць ў начы...
Пагляд вачэй людзкіх
адчуеш, як лязо стальное нажа,
і кожны голас —
блізкі табе учора, —
маўчаньнем страшнейшым ад дакораў,
і ад пагарды — загучыць.
Сам
праклянеш
той дзень,
тую гадзіну.
Аддаў-бы мо' жыцьцё,
каб толькі змыць
з твару
чорны сьлед...
Ідзі!
Мы ўсе і
наднарачанская краіна
перанясём бяду,
як шмат перанясьлі другіх ня гэткіх бед...

4

Не ляці туды, дзе вечар
сьцеліць захад макам-хусткай,
не ляці туды, дзе вецер,
ды лятуць у вырай птушкі!

Бо ня хопе табе сілаў, —
будзеш сьніць свае разоры;
хоць на зломаных мо' крыльлях,
а вярнешся на вазёры.

Ці вясёлым, ці ў задуме
ахінуўшыся у шэрай,
у сасновым ціхім шуме
прывітаеш сіні бераг.

А калі заснуць прыдзецца
на вастрожных можа нарах, —
занясі на крыльлях, вецер,
песьні вольныя на Нарач!

Занясеш, — там іх пазнае
Беларусь мая і бацька, —
толькі сумна не сьпявае
хай над возерам батрачка!

. . . .

— — — — — — — — —

Г р ы ш к а

Цяжка, брат, ісьці,
ўжо выбіліся з сілы.
Дарога: лес, імшары, балаты,
а мы і ранаў добра не абмылі.
Ну што-ж, —
хоць да вазёр,
ці дапляцешся ты?

П р а х о р

Дай вады! Агнём пячэ,
у роце горка...

Г р ы ш к а

Мо лепш табе плячо перавязаць?
Спачнём...
Як толькі вечар крыльлем сломкі

ўзмахне над лесам, зоры замігцяць, —
зноў пайдзём, туды, на ўсход, дзе нашы хаты...
Пакуль загляне золак з пад рукі,
на паплавох між лазьнякоў кудлатых,
пакуль нат загалосяць кулікі,
на месцы будзем мы. —

Памалу з лісьця вецер
зьвявае цені і
на мох
кладзе.
З вяршын зарой звон камароў ліецца,
зьвініць ў маліньніку, у ляшчэўніку, ў вадзе.—

Прахор

Я мо' не дайду.
А нашую работу
няхай далей і без мяне вядуць...
ды мо' памогуць падрасьці сіротам,
мо' паласу калі арцельлю узаруць. —

Вечар жменяй захаду раскінуў зоры,
на камарыных струнах скрыпкаю гучыць;
за паплавамі з жабамі гавораць
ўсю ноч варожучы пагоду туркачы.
Дрэміць папараць
на курганох з крушынай
лясным чароўным непрабудным сном
і ледзь шапочуць сінія асіны...

Грышка

Прахор!.. Прахор... пара ужо ісьці

Прахор

Пайдзём!..

5

Гарыць агонь.
Спакойна дрэміць Нарач
і ноч, як песьня ціхая, бяз слоў,
на сонны бераг навявае чары,
калыша хмары — думы рыбакоў.
Часамі, з поля,
падкрадзецца вецер,
рукамі згорне золата з агню
і разсяваючы
нясе
здаецца
загонам зорным поўную сяўню.

Часамі хваля падпаўзе пужліва,
як быццам думае аб чымсь спытаць,
а можа казку з сініх пераліваў
арцелі, нівам хоча расказаць.
Пяску набраўшы ў сінія далоні
вярнецца берагам
пакатым
зноў...
Грызуць мурог папутаныя коні
дзе-недзе звон сарвецца з капытоў.

Першы рыбак

. . . .

Другі рыбак

Ім сьніцца рэха голасу жывога
з пад стрэх сялянскіх,
з над палос
і траў.

. . . .

Трэці рыбак

Цішэй!..
Здаецца недзе шопат з далі,
ці можа вецер ліча каласы...

Зноў успаўзла
на скат пяшчаны
хваля
змываючы людзкія галасы...
Спакойна дрэміць Нарач на прывольлі
і сколькі зор разсеяных гарыць!
Іх ня зьлічыць,
ня вылавіць ніколі
нат' залацістым невадам зары!

6

Грышка

Глянь!
там,
там Нарач, як неба кавалак,
ляжыць абарваўшыся шырака сіне.
А далей,
за берагавым
пяшчаным валам
ляжыць вазёрная краіна!

Прахор

Хоць пад канец яшчэ убачу.
Вецер з ляснога берагу
сонца напіўшыся жоўты, гарачы.
Быццам лістапад убраў хвалі пенай-шэранам
Так, гэта Нарач...

Грышка

Усё тое самае.
Толькі дням
не дагараць спакойна ў сонечным загары,
як перш...
Пара ісьці ўжо нам!

Прахор

Я застануся,
абмыю раны.
Ты пойдзеш ў вёску, хай памогуць,
прыгоняць лодку мо' на бераг рана...
Ідзі... яшчэ далёкая дарога.

Грышка

Там хтось грабе да берагу вяслом.
Ды нешта вецер хвалі моцна сініць.
Ну што-ж — пайду, спытаю, мо'
дзе лепш прайсьці на мядзельскі гасьцінец.

Вецер перабірае
пальцамі тугія струны соснаў
і шум плыве па залатой кары
ў зялёныя вяршыны,
дзе дрэмяць ў шышках залатыя вёсны,
начлежных песьняў адгалосы
і пасівеўшыя як мох быліны...
А сонечны, срабрысты звон
разьбіўся ветрам на хвалях шэрых
у дробныя шарахаўкі.
Іх сіні перазвон
прыносяць хвалі,
кагаркі
на бераг.
Часамі змоўкне бор
і слухае, пакуль з глыбокіх нетраў
зноў на барозны сінія вазёр
не паліецца шум
зялёным
вадападам
ветру.
— — — — — — — — — — —

Грышка

Можа ты, дзядзька, перавязеш
на бераг Гатаўскі,
а то ісьці абходам
міль пару прыдзецца найменш.

Рыбак

Не, сынку!
Я тут ад усходу
пераважу вартаўнікоў.
А сяньня, як на безгалоў'е,
. . . .
. . . .
Работы шмат, а нават і на соль
не зараблю, ей-богу!..

Грышка

Дык кажыш каля нарачанскіх сёл
няма дарогі?

Рыбак

Эт, кажуць людзі!
Слухі з поля, з бору прыпаўзьлі,
а тут вазёры разшумяць
па беразе,
па жвіры,—
што быццам двух . . . уцяклі...
Ты можа чуў, аж з падсівога Сьвіру?..
Ты сам ня гатаўскі, а?..

Грышка

Не!..

Рыбак

Так... я перавёз-бы... Відаць і ты падбіўся.

Грышка

Мне ад вясны баліць нага.
Глядзі, як вецер з Нараччу схапіўся!
Ну што-ж, — пайду.
Бывай!

Рыбак

З Богам!
Ідзі праз лес, мо' і удасца як пралезьці...
Ды, паслухай...
Балашы мінай!..
. . . .

Адных бяда павыганяла ў сьвет, —
пайшлі бярозавымі трактамі,
разьвітаўшыся на век
з вазёрамі, з невадамі, з хатамі,
пайшлі, як бежанцы вайной.
Другія асталіся на зімоўку,
каб посьле . . . .
насевак вынясьці сяўнёй.
Ад Палесься да Дзьвіны,
ад захаду да ўсходу сьляды
ляглі і тропы...
. . . .

Вартаўнік

Ты з некім гаварыў?
Што? Аб пашы?..
Чаго тут поўзае у будні дзень?!

Рыбак

Гэта, пан, чалавек свой, —
з вёскі нашай...

7

Прахор

Зноў апусьцелі: бераг, трысьнікі,
толькі хмары кудзеляцца белыя.
Нейкі боль гарачы,
цяжкі,
вожыка быццам ў грудзёх скура калючая шэрая.
Хоць-бы жменю вуглёў удалося заліць,
што гарыць у грудзёх,
як на вогнішчы дымным!..
Можа гэтым прыбоем, што ў пене кіпіць
і зьліваецца з берагуліўнем. —

Залатым пяском усланае дно,
дрэміць сном залатым бяз просыпу,
толькі вецер пахне борам, сасной
ды хваляў срабрыста-зялёныя розсыпі.—

— Нарач!!.
Нарач!.. Нарач...
Родны бераг імглою заткала.
Там вербы, хата, сям'я... —

Сінія хмары
плывуць на спатканьне валам.

Хвалі вышэй і вышэй,
хвалі сінія, срабрыста-залатыя.
Вось адна дапаўзла да грудзей,
абняла рукой-пенай за шыю...
Белай стужкай мільгнуў крыльляў шэраг;
вецер вышэй ўздымае
хваляў мяцель. —

— Братцы, братцы, разам!
На бераг!
Разам цягніце, братцы, арцель!.. —

Хвалі сіняцца з права і з лева.
З пераду вецер кідае цяжкія скібы...
Ўсё глыбей ідзе і глыбей..
Мо' здаецца яму, што цягне ён невад—
цяжкі, поўны палову, срабрыстай рыбай.
Зноў вырас перад вачыма вал.
На дне за дрот зачапіліся ногі.
Сыпецца пена,
як сьнежная лавіна
з сініх скал.
Зноў і зноў хваля загарадзіла дарогу.
Падняла, ўскалыхнула,
як маці
калыскай...

— Братцы!... Памажэце!..
Братцы!!!
. . . .

Недзе кнігаўка крыкнула блізка,
ды неба адцьвіўшы
вячэрняй зарой
пачало
асыпацца.

(Канец часткі шостай).

Вільня, 19.XII.36.

МАКСІМ ТАНК

Паэмы Міхася Машары

У гэтым ёсьць нейкі фаталізм: Машара выявіў свае якасьці паэта ў мамэнце, калі ў Беларусаў з гэтага боку рыскай мяжы паўстаў ваканс на буйнейшага песьняра.

Усход ягонае зоркі прыпадае на пару дэзэрцыі Аўгеня Бартуля з нашага літаратурнага фронту. Быў час, калі Бартуля залічалі да авангарду, гэта быў кандыдат на народнага паэта — надзея працоўных масаў на беларускім Парнасе! Так у часы заціўша пасьля грамадаўскага Sturm und Drang'у чуліся гукі Бартулевае ліры поўныя пралетарскага энтузыязму:

„Я не забыўся цябе, мой станок,
Помню...
Сталёвы твой звон;
Стану ў рады, як пакліча гудок,
Як клічам расьпеніцца ён."

Нядарма крытыка ставіла яго побач Уладыслава Броневскага. Бязспрэчна, былі ў іх супольныя матывы і супольная вера:

„Warczą traktory, prują ugory
Jutrznia swobody świeci szeroko"...

Іншая справа, што Бартуль далей трактараў неяк не пайшоў (Аб трактарах ён пісаў у 1929 г.). Жыцьцёвыя нягоды ў форме легіону „młodych" і судовае аплікантуры адцягнулі яго ад беларускага творства. І гэты без пары памёршы (для беларускае справы) паэт пакінуў сучасным толькі элегійны настрой і асірацелую „Князёўну".

Але беларуская глеба настолькі ўраджайная, што на месца адыйшоўшых выдае з сябе цэлы сьцяг новых талентаў, стойкіх вартаўнікоў народнае справы. Адно з перадавых месцаў сярод іх займае Міхась Машара.

Пра Машару можна сказаць, што гэта сялянскі паэт, ахопліваючы ў сваім творстве рытм агульна-нацыянальнага жыцьця. Мастацка апяваючы сучаснасьць, ён, адначасна, пракладае кладку ад мінуўшчыны да будучыні. Памінаючы шурпатасьці і перабоі ў мэтрыцы, ён вельмі ўпадабняецца, як тэматычны контынуатар, да Янкі Купалы з часоў „Шляхам Жыцьця" і „Спадчыны". Таксама адраджэньне і мінулае краіны зьяўляюцца галоўнымі матывамі ягонае ліры. (Трэба адзначыць, што тэрмін „адраджэньне" ў сучасны мамэнт ёсьць анахронізмам: сёньняшні дзень — гэта пара разбудовы нацыі. *Пэрманэнтнага адраджэньня быць ня можа!).* Шукаючы сюжэтаў у гісторыі і апрацоўваючы іх, паэт выдатна прычыняецца да паглыбленьня працэсу ўсьведамленьня мас. І з гэтага гледзішча найбольш вартаснай зьяўляецца паэзія Міхася Машары.

На першы пагляд лірыка Машары блізка падходзіць да напеваў паэтаў-нашаніўцаў — тыя-ж саламяныя стрэхі, пяшчаныя палоскі і прыдарожныя крыжы, у сапраўднасьці розьніца ёсьць колёсальная: замест сьлёз беспатольных, мэлянхоліі і адчаю — оптымізм і бадзёрасьць. Гэты оптымізм можна назваць характэрнаю рысай усяе паэзіі песьняра.

„Годзі ныць! Годзі плакаць і каіцца,
Што прайшло, нам таго не вярнуць,
Над зямлёю зара разгараецца;
І бадзёрыя песьні плывуць".

І запраўды можна ня дзівіцца, калі мінорныя тоны зашмат прабіваюцца ў паэзіі „нашаніўцаў" — „нашаніўцы" былі пачынальнікамі і павадырамі, будучыня была праблематычнай, таму мінуты сумніваў і духовага разладу адлюстроўваюцца ў іх творстве; што датычыць Машары, дык ягонае творства разьвіваецца ў іншых варунках, коньюнктуральна ня лепшых, але ня выклікаючых ніякіх сумніваў аб будучыні. *Пара Машары ёсьць парой разбудовы беларускай нацыі.*

Першыя дробныя рэчы, выйшаўшыя з-пад пяра нашага песьняра, не давалі меры дзеля сконстатаваньня ягонага таленту і толькі пазнаёміўшыся з далейшымі паэмамі чытач даходзіць да шчырага захапленьня. У месячніку „Нёман" у 1932 годзе друкавалася паэма *„Валачобнае"*, напісаная паэтам у Лукіскім вастрозе ў 1929 г. Зьяўленьне паэмы было роўназначна з выстаўленьнем дыплёму М. Машыры на тытул паэта ў найпачэсьнейшым значэньні гэтага слова.

„Валачобнае", паганска-хрысьціянская імша за беларускае адраджэньне, проста зьдзіўляе багацьцем сваей кампазыцыі. Цэлая паэма напісана розным мэтрычна вершам, так пяшчотна абробленым і так трафна датарнаваным да зьместу і з гэткім выкутым рытмам, што літаральна зачароўвае і змушае да сталага паўтараньня, не даючы адарвацца ад яе.

Падобнага дасканальнага тэхнічна і музыкальнага твору Машара пакуль што яшчэ нам не задэманстраваў. Гэта ня вершы, але складовыя часткі нейкай сюіты:

„Сінь ты сінь вясьняная!
Зноў зьвініць ручэй.
Зноў-жа сонцам п'яны я, —
Сэрцам маладзей.
Лашчуцца, шчакочуцца
Цёплыя вятры.
Зноў мне брызгаць хочацца
Соладам вясны".

———

...„Я — паверце —
Веру ў шчасьце на зямлі
І усіх хто чысты сэрцам
Заклікаю да імшы,
Дзе мужык дзіцячай верай
Расьпявае трапары. –
— Адчыні нам, Божа, дзьверы
— Доўга сьнёная пары." —

———

„Не таю,
Што краду
Адпянае рэхам жыцьцё:
Я пяю
Бо душу
Маю паліць жаданьне адно.
Пакуль дух
Не патух
Недасьпелыя думкі кілаць,
Пакуль слух
Ловіць рух
Песьні сеяць на сонную гаць".

———

„Гэта ня песьня — імкненьне,
Буйны вясновы прыліў
Веры ў тваё Адраджэньне,
Ў заўтра ваколіц і ніў.
З шумам лясным на прадвесьні,
З першай грымотай вясны,
З першае жаўрука песьняй
Радасьць нясу вам браты".

І хоць аўтар „Валачобнага“ не належа да кірунку імпрэссіоністаў, паэма гэтая бязспрэчна мае колер, мае сваю зраковую трансформацыю, як музыка Дэ-Бюссі і Равэля.

Кранаючы паэмы Машары, трэба спыніцца на *„Сьмерці Кастуся Каліноўскага“*. У ёй вызначаюцца заганы, якія датычаць, галоўным чынам, тэхнікі вершаваньня. Побач строфак здраджываючых руку сапраўднага маэстро трапляюцца моцныя каструбатасьці. Калі дадамо некаторыя макаронізмы, псуючыя агульную композыцыю, дык не адрэчы будзе пажадаць, каб да другога выданьня аўтар выкінуў гэтыя недагляды.

„Сьмерць Кастуся Каліноўскага“ — гэта апотэоза патрыётызму, патрыётызму прадуманага, якога ў сучаснай белпаэзіі няшмат.

Да апошніх часоў К. Каліноўскі быў нейкім сфінксам у беларускай гісторыі і літаратуры. У творы Машары „Літвы Дыктатар“ у паказаны мамэнт свайго жыцьця надта плястычна прадстаўляецца чытачу і хоць стылізаваны, зрэштаю, як кожная іншая гістарычная постаць, перастае раз назаўсёды быць тэй гіпсавай маскай, каторай ён уяўляўся нам дагэтуль.

Як і ў іншых паэмах нашага песьняра, таксама і праз „Сьмерць К. Каліноўскага“ праходзіць нязломная вера ў лепшае заўтра. Сьмерць каліноўскага — гэта ахвяра неабходная дзеля будучага вызваленьня Народу. Ягоная Гальгота ёсьць зарукай ускрашэньня Беларусі.

„Народзе, ўстанеш! і парукай
За лёс твой сёньня сьмерць мая.
З нядолі, зьдзеку, крыўд і мукаў
Паўстанеш — да жыцьця!“

Машара глыбока ўглядаецца ў сэнс жыцьця, у сэнс разьвіцьця гістарычнага. Ён добра разумее, што толькі моцна сцэмантаваны народ будзе магчы забясьпечыць сабе трывалае і слаўнае існаваньне; гэта-ж залежыць ад ступені нацыянальнай культуры, якая не зьяўляецца нечым раптоўна зьявіўшымся, але ёсьць вытварам мінулых пакаленьняў з комплексам іх моральных, матэрыяльных, псыхічных і інш. свомасьцяў. Ён разумее нацыянальную культуру, як уласную сыстэму вартасьцяў кожнага народу.

Чытаючы апошнія радкі паэмы, некаторыя ассоцыяцыі прыходзяць на думку.

...„І з ім яго сябры змаганьня,
Героі Польшчы і Літвы.
Разьбіткі грознага паўстаньня
Народу верныя сыны“.

Ці-ж ня горкая іронія на сяброў змаганьня, прайшоўшых праз рэінкарнацыю, уцелесьненых у нейкіх „хохлікаў“ Выспянскага?...

З навейшых твораў Машары *„Мамчына Горка“* ўводзіць нас у беларускае Рококо. На канве беспрасьветнага прыгону і яснавяльможных рэнэгатаў, у пышных камзолах і пудраваных

парыкох,—снуецца смутная аповесьць аб любві графянкі да сялянскага хлапца. Становішча графа вядомае—жорсткае і бяскомпромісовае. У выніку конфлікту, Янка, шукаючы справядлівасьці, уцякае ў стары бор да бунтароў-разбойнікаў, разам з каторымі паліць графскі палац і забівае графа Лапату.

Тутака маем дачыненьня з водгульлем тэй барацьбы, якая вялася на беларускіх прасторах у першай палавіне 17-га стагодзьдзя, з водгукамі вольніцы, што праняслася па паўдзённай Беларусі і зьвязана з імям зацярушанага ў нашай гісторыі „палкоўніка беларускага“, аб якім жменю вестак падавалі ў сваім часе некаторыя украінскія жаролы.

„Мамчына Горка“ напісана ў форме народнага эпосу і мае шмат прыгожых уставак, як напрыклад у заканчэньні:

Легенды, легенды сівыя, —
Мінулае нашай зямлі, —
Курганы, магілкі старыя
Вам сховам вякамі былі.
Прыгожымі снамі сягоньня,
З далёкай, таёмнай цішы;
Вы з ветрам ціхім ў перазвоне,
Вы ў шолаху траў на мяжы.
І шэпчаце чарамі байкі
Пра праўду калісьці жывых;
Пра тайны жыцьця бяз утайкі.
Пра дзеі адных і другіх.

Сярод зах.-беларускіх песьняроў Машара крыху „фэміністычны“ і таму ягоная лірыка больш прыбліжаецца да паэзіі Арсеньневай, чым да Танка.

Прынята кожнага паэта кваліфікаваць да нейкага кірунку ці школы. Гэта зьявішча часта мае штучны, ненатуральны характар: мастаку прыпінаюцца атрыбуты і номэнклятура, аб каторых ён ніколі ня сьніў і да сваяцтва з каторымі прызнаецца толькі пад прэсыяй крытыкаў і рэцэнзэнтаў.

Найдагадней будзе залічыць Машару да нэорамантыкаў у тым значэньні, у якім гэная дэфініцыя тасуецца да сымбалістаў і імажыністаў. З гэтых апошніх на расейскім грунце найбліжэйшым сваяком Машары зьяўляецца Сяргей Есенін. Дзеліць іх пераважна адношаньне да Бога: — ў той час, калі Машара заняў да апошняга лёяльную пазыцыю, Есенін выразна богахульствуе:

„Время мое приспело,
Не страшен мне лязг кнута;
Тело, Христово тело
Выплевываю изо рта“.
(Инония).

Але ўяўленьне вёскі ў Есеніна і ў Машары надта падобнае: і ў аднаго і ў другога выступае адноўленая надыхнёная вёска, у каторай жыцьцё б'е крыніцай і вырастае панад старыя формы быту. У вёску Машары ўрываецца разгул, таксама як у вёску Есеніна, і гэты разгул у паэтаў адзначаецца чаруючай прыгожасьцю. Есенін баяўся індустрыялізацыі, наступ каторай на вёску насіўся ўжо тады ў паветры, трэба адзначыць, што Міхасю Машары машыны таксама неяк не ўсьміхаюцца... Чаму, рэч цалкам зразумелая, і на гэтым цяпер спыняцца ня будзем.

З беларускіх гоняў выйшаў пясьняр, значэньне каторага аграмаднае ня толькі для нас, але і для Беларусі замежнай. Ён гэрольд народнае справы паза ўсімі межамі і кардонамі. І з васількових палёў Дзісьненшчыны ўва ўсе куткі краіны даходзяць словы нязломнае веры, што:

Будзе дзень...
Будзе радасьць і шчасьце...
Будзе сонца над новай зямлёй.
Будуць людзі бяз сьлёз і пракляцьця.
Жыць у згодзе вялікай сям'ёй.

І аб чым так у змроку туманным
Цяпер мроім стамлёныя мы, —
Будзе зьместам прастым і рэальным
На запраўды аджыўшай зямлі.

А. БУЖАНСКІ

---

* * *

Лёгка ўздыхнулі у полі вятры,
сонца ясьней узышло як учора,
жаўранак недзе у хмарах разьліў
звонкае гора.

За баразною ішоў аратай,
ціха на коніка нукаў,
можа ня цяжка, а неяк сьпіна
гнулася крукам.

Думаў пра хату, што хлеба няма,
хоць за стол дзеткі паселі,
маці на пальцах худых да жніва
лічыць нядзелі.

Не сумавалі чамусьці цяпер
за пустой міскай чацьвёра,
грэла мо' сонца у вокны ясьней,
лепш як учора.

НІНА ТАРАС

Вільня, 4.IV.37.

Уладыка Віктар Садкоўскі ў барацьбе з беларускім языком у Случчыне

Варшаўская праваслаўная мэтраполія ў 1935 г. запачаткавала ў Варшаве навуковае, абапёртае на жаролах, выдавецтва п. з. *„Праваслаўныя тэолёгічныя расправы"*. Дагэтуль выданы том І. Зьмяшчае ён магістэрскую працу Аўгеня Саковіча на тэму: *Праваслаўная Царква ў Польшчы ў пару Вялікага Сойму 1788—1792* (Варшава 1935). Ня гледзячы на поўную службовую залежнасьць аўтара ад польскай аўтокэфаліі, сумленны праваслаўны дасьледчык гісторыі Царквы ў Беларусі паказаў на сьвятло дзеннае сапраўды цікавыя рэчы.

Беларускі калісь княжацкі Слуцак належаў тады да пераяслаўскага і барыспольскага праваслаўнага біскупства, на чале якога ў гэным часе — пара Вялікага Сойму 1788—1792 — стаяў уладыка Віктар Садкоўскі (1785—1795—1803). Гэты архірэй выйшаў із школы ведамага русыфікатара Беларусі, магілёўскага архіяпіскапа Юрага Каніскага ці Канінскага (1761—1795). Некалі гадунец кіеўскай духоўнай акадэміі, Віктар Садкоўскі робе шыбкую духоўную кар'еру. Пачарзе быў прэфэктам магілёўскай сэмінарыі, прыбочным намесьнікам Юрага Каніскага, капэлянам расейскай амбасады ў Варшаве, пасьля чаго дзякуючы гэтаму архіяпіскапу і пратэкцыі магутнага расейскага амбасадара ў Варшаве графа Стакельбэрга, поўнасьцю мінаючы польскі ўрад, не гаворачы ўжо аб нястачы прэзэнты калятара і намесьніка на Слуцак Караля князя Радзівілла, астаецца архімандрытам праваслаўнага сьвятатроецкага манастыра ў Слуцку, выключна на падставе ўказу Сыноду ў 1785 г. Мала гэтага, новы архімандрыт атрымлівае 27.VII. ст. ст. таго-ж году біскупскую хіротонію і астаецца пераяслаўскім і барыспольскім уладыкам з тытулам коадъютара (вікарнага) старой Кіеўскай мэтраполіі. Якім рашучым быў тады расейскі ўрад адносна б. Рэчыпаспалітай, відаць з таго, што ня пытаючыся нікога перанёс рэзыдэнцыю пераяслаўскага біскупства з Расейскага Царства ў належачы тады да Рэчыпаспалітай Слуцак, або іншымі словамі самастойна эрыгаваў у *чужым* краю *новы* біскупскі пасад! Пасьля гэтага пайшлі дастатачна шчодрыя датацыі на мэты пабудовы праваслаўнай катэдры ў Слуцку, на ўстройства духоўнай сэмінарыі і на высокую для архірэя пэнсыю. Душой і целам аддадзены Расеі, уладыка Віктар Садкоўскі хутка сам выканаў прысягу вернасьці для царыцы Кацярыны II, не шкадуючы жыцьця да апошняй каплі крыві, і зажадаў таго-ж ад падуладнага духавенства, каторае ўмеў пазьней падбухторыць нават да бунту супроць Рэчыпаспалітай.

Дзеля зрусыфікаваньня наскрось беларускага краю, новы ўладыка загадаў зараз навучаць народ толькі з расейскага „Сокращенного Катехизиса", у якім дзіўна злучаліся дбайнасьць аб хвалу Божую і памыснасьць царквы, сьляпое служальства палі-

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

тычным інтарэсам Расеі і тупое падданства расейскім монархам (Тад. Коржон. *Унушраныя падзеі Польшчы за Станіслава Аўгуста* (1764—1794). Том І. Кракаў-Варшава 1897).

Вось-жа ў часе ўрадаваньня ў Слуцку ўладыкі Садкоўскага адбыўся там мясцовы епархіяльны сабор епархіяльнага духавенства. Ведаючы справы Сабору, Аўгень Саковіч падае ў названай вышэй працы фрагмэнт даслоўнай прамовы высокага дастойніка царквы да мясцовага духавенства. Гаворыцца ў ім так:

Я вас скорэню, знішчу, штоб і языка не было вашага проклятаго літовскаго й вас самих, я вас у зсылкі паразсылаю, альбо ў салдаты пааддаю, а сваіх з закордону (г. зн. з Расеі) *панавожу!..* (79) Зацытаваныя ў працы, ведама, напісанай цалком парасейску, беларускія, хоць з дыялектычнымі асаблівасьцямі ўжо Усходняй Беларусі, словы ўладыкі Садкоўскага сьведчаць наўперад аб тым, што архірэй быў відаць сам Беларусам (магілёўскім ці смаленскім?), што аднак яму не перашкаджала быць адначасна – хоць гэта выглядае на парадокс—фанатычным ворагам ужываньня падуладным клерам таго-ж беларускага языка. *Выкараню, знішчу ваш праклятый літоўскі язык*, крычыць із свайго трону поўны палкай ненавісьці ўладыка Садкоўскі, а моцныя ўдары аб зямлю жэзлам садзейнічаюць ягоным словам да перапалоханага клеру. Але мо' ёсьць тут якая памылка адносна адпаведнага азначэньня языка? Аднак-жа *ваш праклятый літоўскі язык* ня можа азначаць у гэтым месцы ніякім чынам ані польскага языка, з каторым лічыўся ў адміністрацыйнай практыцы гаворачы гэныя словы, ані таксама літоўскага языка, каторым пэўне ніхто з праваслаўнага духавенства ў канцы XVIII в. у Слуцку не карыстаўся. Астаецца тут прызнаць, урэшце адразу гэта кожны сьведамы пойме, што ўвесь гнеў уладыкі накіраваны тут супроць беларускага языка, каторым калі ня ўсе, то прынамсі і пэўне большасьць духоўнікаў (іначай так вострае выступленьне ня мела-б сэнсу!) тады карысталіся ці то ў сьвятыні, у пазалітургічных чыннасьцях (пропаведзі, песьні) ці то асабліва ў хатніх адносінах (з сям'ёй і чэлядзяй). На першы пагляд паказываецца тут супярэчнасьць: уладыка Садкоўскі, сам прамаўляючы пабеларуску, граміць іменна ўжываньне гэтага языка. Ці гэта дапушчальна, магчыма? Гдзе-ж лёгіка? Аднак зусім магчыма, псыхолёгічна ёсьць праўдападобным і з увагі на пададзеныя факты — пэўным.

Ці-ж мы сяньня яшчэ ня ведаем людзей, што раз выракшыся сваіх прашчураў і ня ўмеючы языка народу, да якога хочаць залічыць сябе, змушаюць сваіх дзяцей ці падуладных іменна замест роднага языка — навучаньня языка чужога?! Ці ня змушаюць іх гаварыць дома ці ў таварыстве папольску ці парасейску, пагарджаючы сваёй роднай мовай, а хвалячы чужую? Такіх прыкладаў ня мала ёсьць і ў беларускай вёсцы і ў месце. Іменна такую парадоксальную сытуацыю стварыў сабе сваей ужо

гістарычнай прамовай да духавенства на саборы ў Слуцку ўладыка Віктар Садкоўскі.

„Добрага пастыра" асабліва трывожыла тое, што слуцкае духавенства, пераважна ніжэйшае, гаварыла дома і паміж сабой пабеларуску, менш яго ўжо калола, што слуцкае насельніцтва, апрача шляхты, ужывала, ведама, беларускую мову.

Няшчасьцем было, што гэты маскаль ня год і ня два займаў біскупскі пасад у беларускай Случчыне. Шчырай беларушчыны случчакоў даказываюць многія факты. Вось-жа калі маршалак Вялікага Сойму выдаў унівэрсал у справе забясьпечаньня публічнага супакою, слуцкая праваслаўная кансысторыя сама загадывала *„каб унівэрсал зрабіць приступным для народу"* (106), перакладаючы яго на *рускі* язык. Кансысторскія акты пісаліся тады ў Слуцку *„альбо польскім і рускім языком, альбо толькі польскім"* (203). Адна з пастаноў пінскай кангрэгацыі 1791 г. таксама гаварыла: *„Бакалярамі могуць быць дзякі, што ўмеюць чытаць і пісаць па польску і па руску"* (205). Лёгка зразумеем гэтыя ўступствы на карысьць польскага языка, калі толькі ўсьвядомім факт, што слуцкая шляхта — як каталіцкая і кальвінская, так і праваслаўная, адышоўшы ад народнай масы, была кіруючым дзейнікам у працэсе полёнізацыі касьцёла, збору і царквы, а праз гэта самае і роднага краю.

Гэта толькі эпізод у жыцьці праваслаўнай царквы ў Беларусі. Даказывае ён аднак выразна, што былі часы, калі праваслаўе зросшыся з беларушчынай было для маскоўскай з духа герархіі прыслоўленай соляй у ваччу.

П. КАНТРЫБА

Княжыя магілы ў Давід-Гарадку

У канцы мінулага году ўсю прэсу ў Польшчы абляцела вестка аб адкрыцьці ў Давід-Гарадку, на Палесьсі, трунаў з касьцякамі тамтэйшых князёў з XII стагодзьдзя. Адкрыцьце гэтае зробленае на зямлі Беларускай мае для нас асаблівае значэньне, і мы падаем тутака інфармацыі аб гэтай знаходцы.

У Давід-Гарадку, месьце слаўным вырабам ботаў на ўсё Палесьсе, ад вякоў узвышаецца над ракой Гарыньню гарадзішча з земляным валам, які акружае плоскі верх гары. Народ называе гару „Замковай", бо ад прадзедаў да нашых дзён жыве йшчэ памяць аб замку, які тут некалі стаяў. Калі гэта было — народ ня памятае.

На гэтай гары ў пачатку XIX стагодзьдзя была пабудавана драўляная царква. Нядаўна гэтая царква згарэла. Дзякуючы таму, што будынак быў застрахаваны, страхавое таварыства выплаціла за яе 42,000 злот. Тады сярод прыхаджанаў паўстала думка: за гэтыя грошы і за спадзяваныя ахвяры пабудаваць на тым-жа месцы новую царкву — мураваную. Былі зробленыя пляны, атрыманы дазвол ад уладаў, і работа пачалася.

Пачалі капаць зямлю пад фундамэнты. Культурны слой аказаўся вельмі грубы: каля 5 мэтраў. Пастанавілі дакапацца да грунту. Але падчас капаньня ўсьцяж натыкаліся на розныя перашкоды. Ужо на глыбіні нейкіх двух-трох мэтраў ляжалі ў зямлі таўстыя, смалістыя бярвеньні і дошкі, каторых нельга было выкапаць. Пускалі ў ход тапары й пілы, выразалі замінаўшыя кускі і капалі далей. Урэшце лапаты застукалі па нейкім гулкім памосьце, зложаным з таўстых дубовых дошчак. Памост сарвалі і пад ім убачылі трынаццаць дубовых трунаў, устаўленых у некалькі радоў.

Відаць, баючыся, каб гэтая знаходка не перашкодзіла ў закладцы фундамэнтаў пад царкву, сьвяшч. Беляев (ён-жа — віцэбурмістр у Давід-Гарадку) загадаў павыцягіваць труны, выкапаць у гарадзішчы — воддаль ад месца работы — вялікую яму ды іх тамака закапаць. Труны былі вельмі цяжкія, са сьценкамі, упусканымі ў дно і крышку— зусім без гваздоў: дык дзеля пераносу іх разьбіралі на часткі, касьцякі растрасалі, а пасьля ўсё складалі разам у новай яме. Ці былі тамака якія рэчы? Адны кажуць: былі, іншыя — пярэчаць гэтаму. Калі праўда, што былі, дык ясна, што пры пераносе іх мусілі парасьцягаць...

Аб знаходцы было дадзена знаць старасьце ў Столін. Стараста паведаміў кансэрватара, якому падлягае Палесьсе. Але не падумайце, што ў галіне аховы старажытнасьцяў Палесьсе падлягае віленскаму кансэрватару, як і рэшта зямель беларускіх у Польшчы. Не. Асаблівая „палітыка", якая абвясьціла Палесьсе нейкай „безнацыянальнай" тэрыторыяй, нават і ў гэтай галіне адарвала гэту краіну ад адвечнае сталіцы ўсяго краю — Вільні, ад віленскага навуковага асяродку, дзе сканцэнтраваны досьледы над мінуўшчынай зямель беларуска-літоўскага гаспадарства, — унівэрсытэту Сьцяпана Батуры, ад натуральнае апекі віленскага кансэрватарскага ўраду і аддала пад ахову кансэрватара ў далёкім ад нас чыста польскім месьце — *Любліне...* Рэч зразумелая, што Люблін мала цікавіцца чужым яму і няведамым Палесьсем. Дык не зацікавіўся люблінскі кансэрватар і давід-гарадоцкай знаходкай. Работ ня спынілі: работнікі капалі далей і нішчылі ўсё, што ім замінала ў рабоце...

Давід-гарадоцкі натарыюс Тускевіч паведаміў аб усім рэдакцыю віленскае польскае газэты „Слово". Апошняя зьвярнулася да дырэктара Беларускага Музэю гр. Луцкевіча, прапануючы прыняць учасьце ў экспэдыцыі ў Давід-Гарадок, каб высьніць характар і значэньне тамтэйшае знаходкі.

Беларускі дасьледчык быў першым, хто навукова падыйшоў да гэтае справы і даў агульную разьвязку загадкі, сьцьвярджаючы з усей упэўненасьцю, што *магілы, як і драўляны замак, астача якога крыецца ў зямлі, сягаюць XII стагодзьдзя, а труны, выкапаныя тамака, зьмяшчаюць у сабе косьці давід-гарадоцкіх князёў.*

Вось апісаньне знаходкі ў Давід-Гарадку паводле пратаколу гр. Луцкевіча, які мы мелі магчымасьць пераглядзіць.

Гэтак званая „Замковая Гара" ў Давід-Гарадку, непадалёк ад ракі Гарыні, прадстаўляе круглаватае ўзвышша, склоны якога к Гарыні шмат вышэйшыя, чым у бок места, з прычыны абніжэньня грунту. Верх гары абведзены земляным валам. У паўдзённай часьці валу — выемка: уезд. У дыямэтры гарадзішча мае на вока (абмерыць з прычыны работ было немагчыма) мэтраў 60—70.

Дзеля закладзінаў фундамэнтаў пад царкву зроблены вялікі чатырохкутны выкап, мэтры два ўшыркі і 5—9 углыб. Гэты выкап перарэзаў у розных мясцох астаткі драўлянага замку, каторы як быццам „скрозь зямлю праваліўся": гэткі таўсты на ім пласт наноснае зямлі. У паўночнай часьці гарадзішча, бліжэй да цэнтру яго, на глыбіні 4—5 мэтраў, работнікі наткнуліся на драўляны памост з таўстых дубовых дошчак. Калі яго зьнялі, дык пад ім аказаўся склеп, у каторым — паводле апавяданьня навочных сьведкаў — у правільным парадку, радамі, у адступах каля паўмэтра, стаялі дубовыя труны — лікам 13. Пры экспэдыцыі былі адкрыты ў выкапе яшчэ дзьве гэткія самыя труны.

Кіраўнік мясцовае народнае школы расказаў экспэдыцыі, што побач із склепам быў адкрыты зруб — прыблізна тры мэтры кожны бок квадрату. Яго называлі ўсе „студняй", але з выпытаў выясьнілася, што зруб ня йшоў у глыб — ніжэй роўня грунту, на якім беспасрэдна стаялі труны. Праўдападобна гэта была падстава званіцы пры цэркаўцы, якая магла стаяць на тым

месцы, дзе быў насьціл над склепам (насьціл мог быць царкоўнай падлогай).

Труны прадстаўляюць вельмі цікаўны і рэдка сустраканы тып. Гэта прастакутныя скрынкі з дубовых дошчак, даўжыні 2,30 мэтра. У канцох днішча і крышкі зроблены пазы, у якія ўстаўлены канцавыя сьценкі. Таксама ўстаўлены і бакавыя сьценкі, стоцьныя (без нахілу) да дна і крышкі. Нідзе няма гваздоў і наагул сьлядоў жалеза. Дошкі грубыя — 5—6 см., высечаныя тапаром; знакаў ужываньня пілы ня відаць.

У трунах, якія — паводле апавяданьняў сьведкаў — стаялі ўсе ў адным кірунку — з усходу на захад (твары глядзелі на ўсход, як у кургановых пахаваньнях паганскіх часоў), былі касьцякі, але дасьледзіць палажэньне іх было ўжо немагчыма, бо падчас пераносу на другое месца косьці перамяшаліся. Ляжалі яны на сьпіне. Ніякіх рэчаў пры іх экспэдыцыяй ня было знойдзена, апрача скураных туфляў з ласінае скуры (дзьве пары іх прывезены ў Беларускі Музэй). Ісподняя частка туфляў стаптаная, верхняя — добра захаваная. Пашыты яны былі з двух частак — перадка й задка. Апрача шва, якое злучала гэтыя часткі, яшчэ адно шво йшло падысподам — ад вострага наска да пяткі. На адным чэрапе відаць было сьлед ад даволі таўстой тканіны — праўдападобна астача ад калпака. Пад чарапамі ўсюды сьляды густых валасоў. У некаторых трунах — струхлелыя кусочкі палатна.

На захад ад цэнтру гарадзішча ў пракопе відаць сьляды вялікшае драўлянае будыніны — праўдападобна жылога дому. На паўдзённым захадзе — сьляды меншае будоўлі, у тым ліку — частка сьценкі вышынёй каля 2 м.; тут-жа даволі грубы слой быдлячага навозу.

Дрэва ўсюды захавалася вельмі добра. Гэта — або дуб, або смалістая сасна. На ўсход ад месца знаходу склепу з трунамі відаць перарэзаны пры капаньні камель сасны, таўшчынёй каля 40 см., вельмі смалісты й здаровы.

Кіраўнік мясцовае школы расказаў экспэдыцыі, што насупроць галоўнага ўезду ў гарадзішча ёсьць сьляды квадратнага, з абсечанымі рагамі, зрубу, папярэчына якога — каля 4 м. Гэта магла быць абаронная башта. Экспэдыцыя не магла яе агледзіць, бо гэтае месца завалена будаўлянымі матарыяламі.

Із сьценак выкапу гр. Луцкевіч павыцягваў кускі глінянага судзьдзя — з самага дна і вышэй — прыблізна на роўні вачэй; яны здадзены ў Беларускі Музэй. Гэтыя чарапкі былі пасланы на экспэртызу праф. Пастэрнаку ў Львоў. Праф. Пастэрнак катэгарычна пацьвярдзіў, што *чарапкі з дна адносяцца да XII стагодзьдзя,* з вышэйшых пластоў — да XVII і XVIII.

Сьлядоў пажару экспэдыцыя нідзе ня бачыла. Ці ёсьць у вале сьляды частаколу, экспэдыцыя праверыць не пасьпела.

Толькі пасьля таго, як у „Слове“ быў надрукаваны абшырны рэпортаж аб давідгарадоцкіх знаходках, адгукнуўся і ўрадавы ахоўца палескіх старажытнасьцяў — люблінскі кансэрватар. У Давід-Гарадок вырушыла з Любліна новая дасьледчая экспэдыцыя, у якую быў запрошаны з Варшавы дырэктар Археолёгічнага Музэю грам. Якімовіч, выдатны знаўца археолёгіі. *Новая экспэдыцыя поўнасьцяй пацьвярдзіла вывады першае.* Але дырэктар Якімовіч сваю дасьледчую працу значна пашырыў: ён паставіў сабе заданьне дайсьці, якія-ж гэта былі князі, косьці каторых гэтак няўважліва патрывожаны ў Давід-Гарадку? І вось да якога вываду ён дайшоў.

У абшырнай стацьці, надрукаванай у „Слове“ з 22.XII.1936, дыр. Якімовіч кажа:

„Няма ніякага сумніву, што адкрытыя магілы хаваюць у сабе косьці князёў. Але — чые? якіх князёў?

„Самы назоў мясцовасьці выразна кажа, што Давід-Гарадок заснаваў нейкі Давід, князь Давід, або гэны-ж Давід падняў даўнейшае аселішча да годнасьці гораду“. — Пералічыўшы далей дзесяць князёў гэтага іменьня, якія ўспамінаюцца ў летапісах у часе ад XI да першае чверткі XIII стагодзьдзя, аўтар адкінуўшы ўсіх іншых, затрымліваецца на адным: князю валынскім, які ад 1100-га году быў князем *пагарынскім* і памёр у 1112 годзе. Гэты князь, Давід Ігаравіч, дастаўшы пад сваю ўладу землі паўз Гарыні, мусіў ацаніць усё значэньне валаданьня вадзяным шляхам, які прадстаўляла Прыпяць і ўліваўшаяся ў яе ў 11 вярстох ад Давід-Гарадка (па простай лініі) Гарынь. Гарынь і Прыпяць — гэта былі вадзяныя шляхі, якія з Валыні, Галіцкага княства, зямель заходне-беларускіх, пачынаючы ад Берасьця, Клецка, Капыля і Наваградка, урэшце — праз названыя землі — із краю ляшскага вялі да Дняпра, а па Дняпры — на міжнародны гістарычны гандлёвы шлях „Из Варяг в Греки“, якім можна было папасьці і да Чорнага, і да Балтыцкага мора, — і наадварот. У мамэнт, калі Давід Ігаравіч дастаў Пагарынскае княства, галоўным местам у ім быў Дарагабуж. Але Дарагабуж стаяў на сярэднім цячэньні Гарыні — далёка ад Прыпяці. Дык трэба лічыць зусім натуральным, што гэты вельмі рухавы і далёказоркі князь надумаў перанесьці сталіцу свайго ўдзелу ў ваколіцы ўтоку Гарыні ў Прыпяць. Гэта давала яму магчымасьць налажыць сваю руку і на Прыпяць ды цягнуць з гэтага вялікія матарыяльныя зыскі. Дыр. Якімовіч думае, што закладзіны Давід-Гарадка трэба аднесьці на час ад 1110 году да году сьмерці Давіда.

„Далейшыя доказы даюць весткі Іпатаўскага летапісу аб дзеяньнях сыноў і ўнукаў Давіда Ігаравіча. Праўду кажучы, гэтыя весткі вельмі скупыя і абмежываюцца бадай выключна інфармацыямі аб учасьці іх у тых ці іншых ваенных паходах; аднак, сярод іх спатыкаем падробнасьць, якая разьвязывае загадку аб Давід-Гарадку. Вось-жа летапісец — зараз пры першым упамінаньні аб князю Усеваладку, сыне Давідавым, — кажа, што

гэта ёсьць „князь из Городка“. З якога-ж Гарадка можа паходзіць сын князя Давіда? Ці-ж не з Гарадка *Давідавага,* як называюць гэту мясцовасьць гістарычныя крыніцы ў працягу чаргі пазьнейшых стагодзьдзяў? Значыць, гэта ёсьць разьвязка загадкі; маем ужо пачатную гісторыю Давід-Гарадка, схопленую і абапёртую на летапісных запісках“.

Далей аўтар сьцьвярджае, што залічэньне патомкаў Давіда Ігаравіча да князёў „гарадзенскіх“, выводзячы гэты прыметнік ад назову „Городно“, было абмылковым: аказваецца, што аўтар Іпатаўскага летапісу запраўды напісаў аб Усевалодку, што ён быў князем „из Город*н*а“, але пасьля перачыркнуў літару *„н“* і паправіў на *„к“*: „из Город*к*а“. На гэту папраўку дасьледчыкі доўга не зварачалі ўвагі, і згэтуль узьнялася блытаніна: князёў давід-гарадоцкіх выводзілі не з „Гарадка“, а з „Горадна“. Папраўку заўважылі толькі ў 1908 годзе — пры крытычным выданьні Іпатаўскага летапісу.

На падставе ўсіх гэтых даных і разважаньняў дыр. Якімовіч робіць гэткі канчатковы вывад:

„Усё паказвае на тое, што весткі крыніцаў, датычачыя гарадзенскіх князёў, паіменна — сына і ўнукаў Давіда Ігаравіча, адносяцца да князёў, сталіца каторых была ў Гарадку Давідавым. І вось мы падыходзім да разьвязаньня загадкі аб магілах, адкрытых на Замковай Гары ў Давід-Гарадку. Аб тым, што тамака пахаваны князі, ня можа быць ніякага сумніву. Малы сьвінтарык у межах княжага гораду можа зьмяшчаць толькі магілы князёў і іхніх сем'яў, найбольш яшчэ — ваенных начальнікаў і княжых духаўнікоў. Якіх-жа ведаем князёў давід-гарадоцкіх? Давіда Ігаравіча, які памёр у 1112 г., і ягоную жонку; далей — сына яго Усеваладка, памёршага ў 1141 годзе, ды трох сыноў ягоных: Барыса і Глеба, пам. пасьля 1168 г., і Мсьціслава, які яшчэ ў 1183 годзе прымаў учасьце ў паходзе супроць качэўнікаў. Крыніцы ня кажуць, ці гэныя тры браты мелі патомства. Дык маем пяць князёў, імёны і час сьмерці каторых нам ведамы, а сярод іх — закладчык гораду. Яны мусілі знайсьці вечны супачынак у сваей сталіцы“. Дадаўшы жонкі князёў, будзем мець ужо 11 асоб, — а ведама, што Ўсеваладка меў дзьве сястры, якія ў свой чарод мелі дзяцей. Урэшце, могуць быць тут пахаваны, як сказана, начальнікі княжае дружыны і духаўнікі.

„Значыць, давід-гарадоцкая загадка была-б разьвязана. Да разьвязаньня яе прычынілася глубае перарваньне вечнага супачынку. Тымбалей трэба шкадаваць, што княжыя косьці былі перамешаны, бо-ж гэта ёсьць бадай ці не адны з першых магілаў, у якіх можна назваць нябожчыкаў па іменьню“.

Ад сябе дадамо, што да паважнае пастаноўкі досьледаў над давід-гарадоцкай загадкай прычынілася і праца ды навуковыя вывады *беларускага* дасьледчыка.

З песьняй па сьвеце

МІХАЛ ЗАБЭЙДА-СУМІЦКІ

Пойдзеш мо' ня раз па сьвеце песьняй,
Воплескі разсыплюць табе градам, —
Але не забудзеш ты Палесься,
Не забудзеш Край Свой на эстрадах!

А калі спаткаеш людзей сьмелых
І людзей такіх, як мы, ў нядолі, —
Не забудзь, запей аб Русі Белай
І аб Нашых Песьнях і аб Волі!..

МАКСІМ ТАНК

Беларускі народ стварыў багатую песьню, якая даўно прыкавала да сябе ўвагу прадстаўнікоў высокай музычнай культуры. У гэтай песьні паэзія слова і арыгінальнасьць яснай, пластычнай мэлёдыі зьліваюцца ў адно арганічнае цэлае, твораць тыя скарбы, дзе можа найболей захавана духовай красы — характэрнай адзнакі ўсёй беларускай народнай творчасьці.

Такія вартасьці маглі радзіцца толькі ў народзе жывым, здольным, перад якім адкрываюцца шырокія гістарычныя пэрспэктывы.

Сьледам за беларускай песьняй народ наш з нізоў сваіх пасылае ў сьвет пяюноў і музыкаў, якія ўжо карыстаюцца эўрапэйскай славай.

Праўда, ня ўсе з іх выступаюць пад сваім уласным імям. Ёсьць такія, што саромліва хаваюць сваю народную прыналежнасьць, сваё імя ў чужыя рызманы. Такая псыхіка — гэта спадчына нявольніцтва, якую пакінула па сабе прыгонная царская Расея.

Але побач з гэтым народ пасылае і тых, што не саромяцца сваей роднай сьвіткі, не дэкаруюцца чужымі плашчамі, а шануюць імя таго народу, з гушчаў якога яны выбіліся на паверхню. Да ліку гэтых слаўных сыноў Беларусі на сьпявацкай ніве трэба залічыць у першую чаргу саліста ў опэры, тэнара Міхала Забэйду-Суміцкага і баса Паўла Пракапеню. Абодва яны — дзеці нашай палескай вёскі (Косаўскага павету), з якою ніколі не парываюць сувязі.

М. Забэйда-Суміцкі радзіўся ў 1900 годзе ў в. Шэйпякі каля Ружаны. Вырас у сялянскай сям'і, пазнаў жыцьцё з яго вясковымі бедамі і радасьцямі, навучыўся ад маткі любіць народную песьню — душу „простага народу“ — і гэтую любоў пранёс пазьней праз увесь сьвет ад Далёкага Усходу ў Заходнюю Эўропу.

У 1915 годзе ваенная завіруха выкінула яго на ўсход: Смаленск, Пенза, Барнаул на Сыбіры і ўрэшце далёкі Харбін. За гэты час Забэйда-Суміцкі скончыў вучыцельскую сэ-

мінарыю, вучыцельскі інстытут, а ў Харбіне ўжо эканамічны аддзел юрыдычнага факультэту мясцовага унівэрсытэту. Здабываючы асьвету, ён адначасна працуе, як настаўнік, у розных школах, апошняя з якіх — сярэдняя гандлёвая школа ў Харбіне.

Ад дзіцячых гадоў Забэйду-Суміцкага цягне да сьпеву. Зарабляючы ў школе на кавалак штодзеннага хлеба, ён знаходзіць хвілінку і для песьні. Але грунтоўна пачаў працаваць над сьпевам і наогул над музыкай у Харбіне, пад кіраўніцтвам партнэркі Шаляпіна Юліі Плотніцкай, Мэттэра і Томашынскай. У гэтым часе пачынаюцца яго першыя выступленьні ў Харбінскай Опэры, як саліста ў ролі Ленскага ў оп. „Евгеній Онегін"—Чайкоўскага, у ролі князя ў оп. „Русалка" — Даргомыжскага і Леля ў оп. „Снегурочка" — Рымскага-Карсакова. Аб тагачасных яго выступленьнях крытыка ў адзін голас прарочыла яму вялікую будучыню артыста.

Так пасьля „Евгенія Онегіна" з удзелам М. Забэйды харбінская „Зоря" у № 300 з 1929 году пісала: „Ему (М. Забэйдзе) отлично удалась сцена на балу ў Лариных, но в сцене дуэли он превзошел ожиданія". Кітайская газэта „Гунбао" у тым-жа часе піша, што „чуткій музыкальный певец, Забэйда старается осмыслить роль в мельчайших деталях и по возможности перевоплотиться при исполненіи роли. Артист со временем наверное будет пожинать лавры на этом завидном поприще".

Артыст, як чуткі мастак, не паддаецца на аднагалосную хвальбу. У 1932 годзе пакідае Харбін і выяжджае ў сонечную Італію, у Мілан, каб там далей працаваць над сваім голасам пад кіраўніцтвам ведамага прафэсара Фэрнандо Карпі. І тут, як і ў Харбіне, дзякуючы сваім здольнасьцям і працавітасьці, зьвяртае на сябе ўвагу — яго ангажуюць у Міланскую Опэру „La Scala". Італьянская музычная крытыка ў афіцыяльным органе Акадэміі Музыкі „Giornale del arte" раўняе М. Забэйду-Суміцкага з бязсьмертным італьянскім тэнарам М. Скіпай ды з ведамым усей Эўропе расейскім сьпеваком Л. Собінавым. Падобна адзываліся аб ім таксама іншыя італьянскія крытыкі, падчас ягонага канцэртавага турнэ па Італіі, якія трафна зазначалі, што артыст сьпявае ня толькі голасам, але і душой. Напр. „Corriere di Savona" пісала: „Тэнар Міхал Забэйда-Суміцкі і гэтым разам пацьвердзіў здабычы з апошніх сваіх артыстычных падарожжаў. Ён здраджае ўражлівую душу мрыючага паэта, гэтак характэрыстычную для славянаў. Ягоны голас робіць уражаньне дасканальнага інструмэнту, які здабывае і чаруе слухачоў".

Пасьля амаль чатырох гадовага пабыту ў Італіі артыстсьпявак вярнуўся ў 1935 годзе на Бацькаўшчыну, ад якой быў адарваны роўна 20 гадоў. Пасьля некалькіх удачных канцэртных выступленьняў, ён прыняў запросіны ў Пазнань, дзе выступаў салістам у опэрах: „Галька" — Монюшкі, „Рыголетто" — Вэрдзі, „Сэвільскі цырульнік"—Россіні, „Фауст"—Гуно і інш. Кончыўшы свой кантракт з Пазнанскай Опэрай, Забэйда-Суміцкі не пажадаў

узнавіць яго, а пераехаў у Варшаву — дзе карыстаецца вялікім пасьпехам, даючы публічныя канцэрты і ў Польскім Радыё. Аб яго артыстычных здольнасьцях як найлепей адзываецца польская прэса розных палітычных кірункаў пачынаючы ад „Дзеньніка Народовага" і віленскага абшарніцкага „Слова" і канчаючы „Работнікам". Асабліва зьдзівілі варшаўскую польскую публіку выкананыя Забэйдай грэчанінаўскія беларускія народныя песьні на канцэрце ў Варшаўскай кансэрваторыі 27 лютага 1937 г., якія артыст быў змушаны паўтараць. Віленскае „Слово" даючы агляд рэпэртуару М. Забэйды-Суміцкага і яго выступленьняў у Варшаве і ў Пінску, між іншым піша: „Нязвычайная музыкальнасьць, пекны голас, вельмі добра апанаваны тэхнічна ўва ўсіх дынамічных ступенях, надзвычай павабная вонкавая індывідуальнасьць артысты і выразная інтэрпрэтацыя твораў з рознаякімі настроямі, падымаюць артыста да праўдзівых нештодзенных эстрадных зьяваў".

Што-ж датычыць радыёвых канцэртаў Забэйды, то можна сьмела сказаць, што яны зьяўляюцца скарбам для Польскага Радыё. Такога сьпевака, такога выявіцеля народнай душы, асабліва ў народных песьнях,—усёроўна польскіх ці беларускіх—у Польшчы нам не прыходзілася чуць. Нават праслаўлены Кепура не перадасьць і ня здоляе так далікатна выявіць усей глыбіні польскага народнага музыкальнага духу, як гэта ўмее зрабіць М. Забэйда-Суміцкі з польскімі народнымі песьнямі. Калі ў Кепуры стыхія голасу забівае душу, зводзіць усё да нямецкае халоднасьці, то ў Забэйды-Суміцкага наадварот—голас разам са словам служыць для выяўленьня ўсіх тых адценьняў нават самых далікатных і тонкіх у перажываньнях і настроях, якія захаваны ў песьнях.

Толькі такі мастак-артыст, як Забэйда-Суміцкі, патрапіў вывясьці беларускую народную песьню ў шырокі культурны сьвет. Яму першаму належыць чэсьць і ў перадачы гэтых песень праз грамафонныя пліткі для шырокага карыстаньня ў краі і заграніцай.

Р. ШЫРМА

Павал Пракапеня

У 1936 г. падчас канцэрту ў Кракаве Ян Кепура прадставіў публіцы Паўла Пракапеню, каторы прапяяў некалькі арыяў і песьняў. Ён спаткаўся з бурнымі воплескамі і агульным захапленьнем. Потым цэлая сэрыя трыумфальных выступаў у важнейшых гарадох Польшчы і нашага Краю.

Вялізарныя рэцэнзыі ў прэсе, партрэты маладога артыста ў журналах: Пракапеня перад выездам у Рым, Пракапеня накручвае фільм у Бэрліне і г. д. і г. д.

Хто-ж такі і скуль узяўся Пракапеня?

Павал Пракапеня — сын беларускай беднай сялянскай сям'і з Косаўскага павету. Пасьля цэлага сьцягу злыбедаў спаткаўся з Кепурай. Перад гэтым быў статыстам у Варшаўскай опэры; пры помачы Кепуры дастаў стыпэндыю на студыі ў Вену.

Пасьля быў у Мілане, а потым вучыўся ў Рыме ў прафэсара Астольфо Пэккія.

Пракапеня — сьпявак з аграмадным діапазонам і тэхнікай, зорка каторага не дайшла яшчэ да зэніту.

Толькі, як кожны малады талент, ён яшчэ ня вычувае, з чым яму „да твару.“ Паміж іншым пяе ён нікаторыя мала эфэктоўныя італьянскія рэчы, тады, як выканаўшы арыю торэадора з „Кармэн“ змусіў-бы публіку літаральна насіць сябе на руках. На канцэрце, аб каторым ідзе гутарка, у канцы праграмы на нямоўкнутыя бісы Пракапеня сказаў, што выканае песьню са свайго Косаўскага павету і... прапяяў нейкую расейскую песьню аб „Ваньцы і Матрёне!“

Аніводнае беларускае песьні ня выканаў Пракапеня, а расейскія рэчы пяяў ён з нейкім нават піетызмам.

Чулася, што беларускасьць у ім пакрыта покастам (павярхоўным) чужых культур.

Падросткам, нейкіх 15 год маючы, выйшаў ён са сваёй вёскі, пехатой дайшоў да Слоніма, скуль як амэрыканскі трамп, бяз білета, даехаў цягнікам да Баранавіч.

А потым Варшава, Вена, Мілан і г. д.

На чужыне спатыкаўся з палякамі і расейцамі. Усе пракапаўшыся, што маюць дзела з буйнейшым талентам, „чулі“ да яго сымпатыю і рабіліся „сваякамі.“

Вялікая шкода, калі Пракапеня акажыцца страчаным для свайго народу. Гэта бас-барытон, роўнага катораму ў Польшчы нямашака.

Дзе-б ён не знаходзіўся, — ці ў роднай вёсцы Запольле, ці ў кіностудыях бэрлінскае фабрыкі „Ufa,“ ці на рымскім Corso,— ёсьць магчымасьць, што гэтыя радкі дойдуць да яго.

Жадаючы найвялікшых пасьпехаў і уздоймаў, адначасна хочацца прыпомніць словы народнага паэта Якуба Коласа:

...на вашым сумленьні нясплочаны доўг векавы,
То доўг прад народам, то доўг разуменьня,

Якое зачэрпалі вы з народнага скарбу
Душы самабытнай і з скарбу яго мазалёў,
То ён працаўнік наш, то ён старадаўны
Угору вас моўчкі узьвёў!...

А. Бужанскі

Дапаўняючы артыкул грамадзяніна Бужанскага аб вялікім артысьце беларускай зямлі, мне прыемна падаць да аўтаравага ведама, як і да ведама огулу беларускага грамадзянства, што насупроць энунцыяцыяў польскай і нікаторай загранічнай прэсы аб тым, быццам артыст—польскай нацыянальнасьці — ёсьць ён з крыві і косьці Беларусам. Аб гэтым я даведаўся беспасрэдна ад самога гр. Пракапені, з каторым меў гонар пазнаёміцца падчас ягонага быцьця ў Вільні. Паважаны і слаўны артыст у гутарцы са мною сказаў: „быў Беларусам і астануся ім“ — астанецца такім, якім маці нарадзіла, якім фігуруе ў пашпарце. Дагэтуль у сваіх канцэртных выступленьнях нічога не даваў з рэпэртуару беларускага, бо ня знаў яго. Чаму так сталася? Сталася гэта таму, што дасюлешні жыцьцёвы шлях артыста ня спрыяў абзнаямленьню з беларускай музычнай літаратурай. Артыст мае сяньня скончаных 27 год (нарадзіўся ў 1909 г.). Сусьветная вайна тысячы Беларусаў змусіла пакінуць родны край. Гэткі лёс не абмінуў і малога Паўла. Ён разам з бацькамі выяжджае ў 1915 г. у Расею і там (у Ніжнім Ноўгарадзе) астаецца да 1922 г. У гэтым годзе прыяжджае на Бацькаўшчыну. Кароткі час прабывае ў роднай вёсцы Запольле, пазьней апынуўся ў чужым асяродзьдзі.

Вялікі талент артыста заграніца належна ацаняе. У 1932 г. у выніку міжнароднага конкурсу сьпеву гр. Пракапеня здабывае першую нагароду — залаты мэдаль і дыплём, а ў 1936 г. атрымлівае ад папы рымскага ватыканскі ордэр сьвятога Юрага, а ад італіянскага ураду — кавалерскі крыж італіянскае кароны. Малады наш артыст праславіўся сваімі канцэртнымі выступленьнямі ў Італіі, Аўстрыі, Швайцарыі, Нямеччыне, Англіі і ў мінулым годзе ў Польшчы і ў краю. Толькі за два з палавінаю гады перад рымскім мікрафонам даў 54 канцэрты, а ў Мілане, Нэаполю і іншых местах Італіі — 34 канцэрты. Усюды цешыцца прызнаньнем і добрымі ацэнамі. Цяпер перад выездам заграніцу концэртуе ў краю. Дня 4-га красавіка выступаў у Вільні. Незадоўга выяжджае ў Парыж а адтуль на некалькі год у Рым. Артыст запэўнівае, што канцэртуючы будзе даваць і рэпэртуар беларускі. Незадоўга — кажа—пачуеце з рымскага мікрафону нашыя родныя беларускія песьні. Аб часе сваіх выступленьняў будзе паведамляць Беларусаў у краю.

Будучы ў Вільні, гр. Пракапеня знаёміўся з беларускім жыцьцём. Адведаў рэдакцыю „Калосься“ і іншыя беларускія часапісы, а так-жа установы і арганізацыі, што месьцяцца пры Завальнай № 1, адведаў і Беларускі Музэй ім. Івана Луцкевіча на Вострабрамскай 9, гдзе ў кнізе адведывальнікаў запісаў свае уражаньні з Музэю і выразіў радасьць з награмаджаных у ім памяткаў і з развою беларускай культуры. *Я. Ш.*

Сьв. п. Зыгмунт Нагродзкі

(Замест нэкролёгу).

У дзень беларускага нацыянальнага сьвята — 25 сакавіка сёлета — памёр у Вільні шырака ведамы і добра заслужаны краёвы дзеяч на грамадзкай і культурна-прасьветнай ніве сьв. п. Зыгмунт Нагродзкі. Хаця праца яго вялася на польскім грунце, але памёршы дзеяч гэтак крэпка быў зьвязаны з нашым краем, гэтак горача любіў нашу старонку, сынам якое сябе пачуваў, што заслужыў на ўвагу і з боку беларускага грамадзянства, з якім здаўна блізка жыў.

Нагродзкі жыў і працаваў на грамадзкай ніве ў тыя часы, калі колішні польскі паўстанцкі лёзунг „за вашу і нашу волю“ меў яшчэ істотнае значэньне. Пакаленьне, да якога належаў Нагродзкі, ішло запраўды рука ў руку з беларусамі ў барацьбе з варожай да абодвух народаў царскай Расеяй. Але і паміма ўплыву панаваўшае тады ў грамадзянстве атмасфэры памёршы дзеяч меў глыбокі сэнтымэнт да беларусаў, да іх працы над нацыянальным адраджэньнем. Справа ў тым, што бацька Зыгмунта Нагродзкага быў пахтарам у двары Пілсудзкіх Зулаве, і сын ад дзіцячых гадоў быў зьвязаны і з дваром, і з беларускай вёскай, дзе слухаў беларускія народныя песьні, казкі, легенды, прыглядаўся да народных звычаяў і забаваў, гутарыў з вясковымі дзяцьмі пабеларуску. Але ідэолёгічны ўплыў сям'і Пілсудзкіх, у якой заўсёды панаваў незалежніцкі польскі дух, пераважыў, і Нагродзкі ўзыйшоў на польскі шлях.

Нагродзкі вельмі цікавіўся ня толькі беларускай народнай паэзіяй, але і паказаўшыміся ў тыя часы ўсё новымі і новымі вершыкамі беларускімі, ці то друкаванымі (творы Дунін-Марцінкевіча), ці пераказванымі вусна. Калі выйшла заграніцай „Дудка Беларуская“ Багушэвіча, дык яна хутка папала і ў Вільню — кантрабандным спосабам. Дайшла яна і да Нагродзкага, які тады ўжо жыў у Вільні і вельмі быў захоплены Багушэвічавымі вершамі, шчыры дэмакратызм каторых цалком адпавядаў ідэолёгіі Нагродзкага. Нагродзкі вельмі хацеў пазнаёміцца з нашым паэтам, і гэта яму ўдалося. Дый яны гэтак здружыліся, што вельмі часта адведывалі адзін аднаго, гутарылі аб цікавіўшых абодвух справах, і паэт чытаў Нагродзкаму свае новыя творы. Нагродзкі працаваў тады ў каапэратыве, якая існавала пры Татарскай вуліцы. Туды прыяжджала шмат сялян па тавары, і Нагродзкі надзяляў іх творамі Багушэвіча, ня гледзячы на суровыя кары, якія пагражалі яму з боку ўлады за пашырэньне „нелегальшчыны“. Калі-ж усё першае выданьне разыйшлося, Нагродзкі за свае ўласныя грошы перавыдаў „Дудку“ ў Кракаве.

У Вільні грамадзкая праца Нагродзкага вялася пераважна сярод рамесьнікаў, бо Нагродзкі хацеў падняць культурны ровень гэтае сфэры працаўнікоў і сарганізаваць яе. Вось-жа на ладжаных для рамесьнікаў вечарынках Нагродзкі часта дэкламаваў беларускія вершы — перадусім Багушэвічавы, апранаючыся ў вопратку беларускага селяніна. Дый сам пробаваў пісаць вершы ў беларускай мове. У архіве Беларускага Музэю ёсьць арыгіналы двух беларускіх вершаў Нагродзкага, дадзеных аўтарам. Першы вершык быў напісаны Нагродзкім у 1901 годзе — у пецярбурскім вастрозе, куды ён папаў за сваю грамадзкую працу. Верш гэты аўтар пасьвяціў сваей жонцы, пацяшаючы яе і абяцаючы хутка вярнуцца, каб разам абдумаць „заплату“ тым, хто мучыць яе „мужыка“. Другі верш у беларускай мове быў пасьвячаны памяці Сыракомлі. Гэты верш Нагродзкі прадэклямаваў на адкрыцьці памятніка Сыракомлі ў Барэйкаўшчыне. Нагродзкі і тут апрануўся ў беларускую сьвітку і выступіў ад імя беларускага сялянства.

Калі ў 1906 годзе ў Вільні пачала выходзіць „Наша Доля“ і наступніца яе „Наша Ніва“, Нагродзкі быў у блізкіх зносінах з сябрамі рэдакцыі, даваў у газэту добра платныя абвесткі аб сваім складзе сельска-гаспадарскіх машын, друкаваў і рассылаў пры газэце свае каталёгі ў беларускай мове і ў патрэбе заўсёды гатоў быў дапамагчы выдавецтву пазыкай усьцяж нехапаўшых грошай.

У тым-жа 1906 годзе ў Пецярбурзе заснавалася беларуская выдавецкая супалка „Загляне сонца і ў нашае ваконца“, якая пастанавіла выдаць усе творы Багушэвіча. Дзеля таго, што Багушэвіч ужо ня жыў, а ягоная сям'я варожа адносілася да беларускае працы яго, дык і ня лёгка было дабіцца дазволу сям'і да права выданьня. Удалося гэтае права купіць у сям'і толькі дзякуючы дапамозе Нагродзкага.

Калі ў выніку сусьветнай вайны адбудавалася Польшча, Нагродзкі цьвёрда стаяў на сваім старым становішчы. Цікавіцца беларускім жыцьцём ніколі не перастаў. Бываў на беларускіх нацыянальных урачыстасьцях, на сьвяткаваньні ўгодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Ахвотна дзяліўся з беларускімі дасьледчыкамі сваімі ўспамінамі і матарыяламі аб мінулых часох. І толькі дзякуючы яму ўдалося захаваць ад загубы некалькі ненадрукаваных яшчэ вершаў Багушэвіча, фатаграфіі, а так-жа высьніць некаторыя няведамыя мамэнты з жыцьця нашага паэта.

Да характарыстыкі ідэолёгіі нябожчыка сказаць трэба, што быў ён усё жыцьцё сваё сябрам тэй перадваеннай духовае эліты, каторая ў аснову сваей ідэолёгіі паклала пашану да Чалавека, шчыра імкнулася да зьдзейсьненьня высокіх ідэалаў Вялікае Францускае Рэвалюцыі і за сваё найсьвяцейшае заданьне лічыла працу над памнажаньнем і пашыраньнем у народных масах скарбаў культуры.

КНІГАПІС

В. Власовъ ф. Вальденбергъ — **Исторія Россіи** (862 — 1920). Изд. „Католическаго Вѣстника“. Харбинъ, 1936 г. бач, V+938, 23+17.

Вялізарная разьмерам гэта кніга прывандравала з далёкага Харбіну ў Вільню ад аўтара яе да яго знаёмага беларускага паэта В. Адважнага. Ад яго мы яе дасталі для рэцэнзіі ў „Калосьсю“. Вычэрпываючай аднак рэцэнзіі рабіць не зьбіраемся, бо на гэта нам не хваціла-б ані часу, ані месца. Агранічваемся толькі гэтай дужа агульнай зацемкай, зазначаючы толькі тое, што ў гэтай кнізе найбольш цікавае і характэрнае.

Вось-жа „Исторія Россіи“ Вальденберга — гэта ня ёсьць самастойная праца, апёртая на крытычнай апрацоўцы гістарычных крыніц; гэта ёсьць компіляцыя, апёртая на гістарычнай распрацоўцы розных ведамых аўтараў, пісаўшых або цэлую гісторыю быўшай Расеі, або гістарычныя расейскія монографіі. Чытаючы „Исторію Россіи“, робіцца ўражаньне, што быццам об'ектыўнай расейскай гісторыі, апрача гісторыі казённай, і сусім ня было. Так дзіўна мала аўтар углыбіўся ў расейскую гісторыю і дзіўна аказаўся залежным ад выснаваў афіцыяльных расейскіх гісторыкаў з яўнай крыўдай для безстароннай гістарычнай навукі.

Усю гісторыю Расеі, мінуўшую й будучую, рысуе Вальденбергъ у аспэкце расейскага вялікадзяржаўніцтва і імпэрыялізму. Ніякіх іншых народаў і іх нацыянальна-палітычных і грамадзка-культурных імкненьняў, апрача „единага русскага народа“, аўтар „Исторіи Россіи“ зусім ня бача. Вось-жа нічога дзіўнага, што Беларускага Народу, а так-жа й цэлага раду іншых, Вальденбергъ сусім не „заўважыў“.

Словам, Вальденбергъ піша на матыў даўно мінулай, імпэрыялістычнай расейскай песьні. А мо' й будучай? Магчыма, але ў будучыне нота гэтай песьні будзе ўсё-ж на новы лад. Народы, суседзі народу расейскага, што сяньня борацца за сваю культурную й палітычную самастойнасьць, на залежнасьць ужо ня згодзяцца. „Як роўныя з роўнымі і вольныя з вольнымі“ — вось агульны прынцып сужыцьця народаў і разьвязкі іх нацыянальнай праблемы.

Трэба аднак аддаць аўтару справядлівасьць, што апрацоўка яго „Исторіи“ пасвоему сумленная й даволі вычэрпываючая. Апрача гісторыі палітычнай спатыкаем у ёй шмат так-жа матарыялу з гісторыі культуры агулам і з гісторыі грамадзкай думкі. „Исторія Россіи“ — гэта свайго роду энцыклёпэдыя расейскай гісторыі старога тыпу.

Нязвычайнай у „Исторіі Россіи“ асаблівасьцяй ёсьць тое, што яна напісана ў каталіцкім духу. Вальденбергъ — гэта расеец

і ідэовы каталік. Гэта пасьлядоўнік даўнейшых расейскіх заходнікаў, з тэй толькі розьніцай, што тыя гістарычныя шляхі для Расеі бачылі, праўда, у заходне-эўропэйскай культуры, аднак да каталіцтва агулам былі неахвотныя, а Вальденбергъ сьветлую будучыню Расеі бача ў заходне-эўропэйскай культуры іменна каталіцкай.

Урэшце трэба адцеміць, што Вялікай Расейскай Рэвалюцыі аўтор „Исторіи Россіи“, здаецца, і дагэтуль не разумее і не ўяўляе яе сапраўдных — палітычных і соцыяльных — прычын.

Ад. Станкевіч

ХРОНІКА

═ Вечар беларускай літаратуры ў Паляноў. У нядзелю 18-га красавіка ў прыватным памешканьні адваката Крыжаноўскага адбыўся вечар беларускай паэзіі, прысьвечаны абазнаямленьню з творствам Максіма Танка і іншых паэтаў з віленскага асяродзьдзя. На вечары былі прысутныя Палякі із адвакацкіх, судовых, навуковых, літаратурных і палітычных сфэраў. Былі так-жа і Беларусы. Пасьля кароткіх інфармацыяў аб беларускім літаратурным жыцьці ў Вільні ў апошнія гады, Максім Танк напачатку прачытаў некалькі характэрных твораў Міхася Машары, М. Васілька, Н. Арсеньневай, Н. Тарасішкі і Хв. Ільляшэвіча, а потым прачытаў фрагмэнты з сваей паэмы „Нарач,“ „Песьню кулікоў“ і некалькі дробных лірычных вершаў. Высокамастацкія творы, хораша прачытаныя нашым песьняром, прыкоўвалі ўвагу і захоплівалі сваім хараством прысутных. Пазьней адбылася дыскусія, у якой адзначаны развой беларускай мастацкай літаратуры. У дыскусіі браў удзел і прысутны генэрал Л. Жэлігоўскі. Арганізатар вечару мэцэнас Крыжаноўскі на заканчэньне горача падзякаваў ад імя прысутных Максіму Танку за ягоны выступ.

═ Новыя гарманізацыі беларускіх народных песень. Малады беларускі кампазытар Аўгень Евец, абсольвэнт пэдагогічных клясаў варшаўскай кансэрваторыі, згарманізаваў на мяшаны хор дзьве беларускія народныя песьні: „Ой я п'яна, п'яненька“ і „Там на ролі, на ральлі, там хадзілі жураўлі.“ Гарманізацыі адзначаюцца значнымі мастацкімі вартасьцямі.

═ У Беластоку мясцовыя Беларусы зарганізавалі нядаўна Коопэратыўнае Т-ва Працаўнікоў Беларускага Тэатру „Полымя.“ Абшар дзейнасьці т-ва — тэрыторыя ўсяе Польшчы. Таварыства мае на мэце пашырэньне тэатральнае культуры сярод Беларусаў і фаховае асьветы ў сваіх сяброў, вядзеньне ўсялякіх тэатральных прадпрыемстваў, вядзеньне коопэратыўна-ўзгадаваўчай дзейнасьці і прапаганда сцэнічнага мастацтва і інш. Таварыства пачало ўжо працу дзеля зарганізаваньня струннага аркестру, хору і драматычнае трупы. Акружны суд у Беластоку дн. 5-га лютага зарэгістраваў гэтую беларускую коопэратыўную пляцоўку.

Беластоцкі Гарадзкі Стараста пакараў старшыню таварыства гр-ку Ганну Абуковіч штрафам 200 зл., паводле беластоцкай прэсы, за тое, што арганізацыя таварыства адбылася без адпаведнага паведамлень-

ня адміністрацыйнай улады. Гэтысамы стараста ня даў таварыству дазволу зарганізаваць канцэрт у дзень 4-га траўня.

═ 4-га красавіка адбылося чарговае паседжаньне Літаратурна-Мастацкае Сэкцыі Беларускага Навуковага Т-ва, на якім гр. Луцкевіч прачытаў даклад, пасьвячаны памяці нядаўна памёршага віленскага дзеяча Зыгмунта Нагродзкага, а так-жа паінфармаваў Сэкцыю аб некаторых недаконченых паэтыцкіх творах Янкі Купалы, рукапісы якіх перахоўваюцца ў архіве Беларускага Музэю. Пасьля гр. Максім Танк пазнаёміў прысутных з першай часткай сваей новай, яшчэ не закончанай, паэмы. Апошняя выклікала жывы абмен думак.

═ У Беларускім музэі ім. Ів. Луцкевіча у Вільні.—Ад гр. М. Караленкі Беларускі Музэй атрымаў цэнны дар:калекцыю гліняных вырабаў ганчара ў м. Рэкаве А. Касьпяровіча. Калекцыя складаецца з 36 штук судзьдзя рознае формы.

Атрыманы так-жэ рад іншых ахвяр ад розных асобаў. Прыемны і цэнны дар атрымаў Беларускі Музэй ад сялянак Ізабэлінскай воласьці, Ваўкавыскага пав., якія сабралі 47 кускоў — узораў тканін свайго вырабу. Кускі невялікія— 20—25 см. шырыні, але даюць поўны ўзор тканіны і зусім замяняюць цэлыя вялікія палотнішчы і гунькі. Гэтая калекцыя тканін з Ізабэлінскае воласьці будзе выстаўлена ў Музэі. Няхайбы гаспадыні і ў іншых воласьцях зрабілі тое самае!

Бібліатэка пры Музэі набыла некалькі цэнных выданьняў у беларускай мове („Сялянка“ Дунін-Марцінкевіча і інш.) і ў другіх мовах, у тым ліку вельмі рэдкае выданьне Аляксандра Ельскага п. з. „Zarys obyczajów szlachty w zestawieniu z ekonomiką i dolą ludu“ (Кракаў, 1897) у двух томах.

—Адведываньне Беларускага Музэю. За першыя тры месяцы гэтага году Музэй адведала 777 асоб, што складае больш за палавіну лічбы адведальнікаў у працягу ўсяго 1936 году. У Музэі працавала некалькі маладых навукоўцаў, у тым ліку—прыезныя з Варшавы.

У сувязі з ладжаным у Вільні „Тыднем прапаганды музэяў“, які трываў ад 18-га да 25 красавіка, за гэты час адведалі Беларускі Музэй 1816 асобаў, у тым ліку 33 экскурсіі. Цікаўна, што Таварыства Прапаганды Турыстыкі, якое зарганізавала „Тыдзень,“ у сваіх плякатах падало сфальшаваны назоў Беларускага Музэю, папросту выкінуўшы нялюбае гэнаму Т-ву слова „Беларускі...“ Дырэкцыя Беларускага Музэю паслала Т-ву свой рашучы пратэст проці гэтага фальшу.

═ Памятнікі беларускім пісьменьнікам. Рэдакцыя „Шляху Моладзі“ запачаткавала акцыю зьбіраньня ахвяраў на памятнік беларускаму пісьменьніку Ядвігіну Ш. (Антону Лявіцкаму). Ахвяры прысылаць на адрас рэдакцыі „Шляху Мол.“ — Вільня, Завальная 1—2.

Памятнік беларускай паэтцы і пісьменьніцы Цётцы (з Пашкевічаў Алёізы Кейрыс) ужо гатовы і будзе пастаўлены і пасьвячаны ў ліпні месяцы, у Лідчыне, гдзе пясьнярка пахавана.

═ „Вечар песьні і паэзіі рэгіональнай літоўскай і беларускай,“ арганізаваны Т-вам Прыяцеляў Бібліатэкі ім. Врублеўскіх у Вільні ў дзень 6-га траўня, не адбыўся з прычыны забароны адміністрацыйнай улады. На вечары меўся выступіць ведамы Беларускі Хор гр. Р. Шырмы.

═ Камісарыят Ураду ў Варшаве не зарэгістраваў статуту „Беларускага культурнага Таварыства.“ Зложаны рэкурс у міністэрства.

═ Беларускі спэктакль у Рызе. Дня 17-га красавіка Беларускі Вучыцельскі Хаўрус саматужніцкім спосабам зарганізаваў у Рызе спэктакль. Была пастаўлена „Паўлінка“ Купалы. Дапоўнілі праграму латвійскія і беларускія песьні, пяяныя салістамі. Спэктакль прайшоў удачна. Асабліва падабаліся публіцы песьні з п'есы: „А у садзе рэчанька,“ „Ці сьвет ці сьвітае“ і „Кума мая, кумачка,“ выкананыя артыстамі пад кіраўніцтвам гр. Янкі Кудраўцава. Адказным кіраўніком вечару быў старшыня Вуч. Хаўрусу гр. П. Мірановіч, які шмат папрацаваў дзеля пастаноўкі вечару.

═ Беларуская Дзяржаўная Фільгармонія. У Менску арганізаваны новы музычны цэнтр — беларуская дзяржаўная фільгармонія. Гэта падзея бязспрэчна вялікай важнасьці. Склад фільгармоніі яшчэ поўнасьцю не ўкамплектаваны. Фільгармонія цяпер складаецца з сымфанічнага аркестру (60 чалавек), хору (50 ч.), ансамблю беларускай народнай песьні і танца (35 чал.), аркестру народных інструмэнтаў (28 чал.), смычковага і вакальнага квартэту. Паводле інфармацыяў сав. прэсы — сымфанічны аркестр зьяўляецца ў фільгармоніі наймагутнейшай адзінкай, мае ўсе дадзеныя для паважнай работы пад варункам пашырэньня і якаснага паляпшэньня складу. Сталым кіраўніком аркестру—праф. Л. Гінзбург. Дзяржаўны хор складаецца з 50 чалавек (а дакамплетаваны будзе налічаць 60 ч.). Галасавыя даныя хору вельмі невялікія. Малая харавая і недастатковая музычная культура, а так-жа адсутнасьць ярка галасавых даных у большасьці выканаўцаў. Ансамбль народных інструмэнтаў створаны з рознастайных народных інструмэнтаў (у ім групы баянаў, лір, балалаек, домр, цымбалаў, жалеяк). Фільгармонія ня мае сваіх кадраў салістаў-вакалістаў і інструмэнталістаў. Дырэктарам фільгармоніі — Г. Прагін, мастацкім кіраўніком — прафэсар Маскоўскай кансэрваторыі Лео Гінзбург (ён-жа кіраўнік сымфанічнага аркестру), кіраўніком хору — абсольвэнт Маскоўскай кансэрваторыі І. Бары.

Фільгармонія мае вялікія матарыяльныя клопаты, ня мае нават свайго памешканьня.

Дня 25-га красавіка адбылося ўрачыстае адчыненьне фільгармоніі. Менская прэса надрукавала чарод прысьвечаных фільгармоніі артыкулаў. Вельмі цікавым і прыемным артыкул праф. Гінзбурга на тэму заданьняў фільгармоніі. Вось што між іншым піша праф. Гінзбург:—

— „Беларусь — краіна багатай народнай песьні, самабытных танцаў, з насельніцтвам ад прыроды глыбока музычным — ня мела, не знаходзіла да гэтага часу форм, праз якія гэтая музычная неабходнасьць знаходзіла сваё выражэньне. Вяршыні музычнай культуры, сусьветная музычная літаратура ў Беларусі пакуль зразумелы толькі вельмі вузкаму колу музыкантаў-спэцыялістаў.

У Беларускай ССР наглядаецца вялікі разрыў паміж ростам агульнай культуры, навукі і тэхнікі з аднаго боку, і музыкі з другога. Арганізацыяй, якая-б запоўніла гэты прабел і якая паставіла-б сваей мэтай дапоўніць посьпехі ў многіх галінах культуры дасягненьнямі ў галіне аднаго з вышэйшых праяўленьняў культуры— музыкі — і павінна стаць фільгармонія...

—Фільгармоніі астаецца... павесьці масы да вяршынь музыкальнай культуры, да асваеньня найвялікшых помнікаў музыкальнай спадчыны мінулага і да стварэньня савецкай беларускай музыкальнай культуры...

— У Менску да гэтага часу не праводзілася ніякай сыстэматычнай канцэртнай работы. І таму важна адразу выбраць напрамак. Работа фільгармоніі павінна будзе пайсьці па двух асноўных руслох: арганізацыя масава-выхаваўчых канцэртаў, знаходжаньне правільных форм, якія вызначаць посьпех або няпосьпех арганізацыі і правядзеньне паказальных канцэртаў сіламі сваіх паказальных калектываў — сымфанічнага аркестру, хору і т. д. Гэтыя паказальныя канцэрты павінны дапамагчы ўзьняцьцю кваліфікацыі менскіх калектываў і многіх выканаўцаў. Адсутнасьць рэгулярных канцэртаў у Беларусі прымусіла ў свой час выехаць адсюль вялікую колькасьць даравітых выканаўцаў. Зьвярнуць іх у Беларусь і стварыць ім і астаўшымся ў Беларусі кадрам музыкантаў максымальна добрыя творчыя ўмовы, а таксама прыцягнуць сюды лепшых савецкіх майстроў — адна з важнейшых задач Беларускай фільгармоніі.“ (Звязда“ з дн. 24.IV.47).

Праца фільгармоніі ўжо запачаткавана. 25-га красавіка наладжаны канцэрт з удзелам сымфанічнага аркестру пад кіраўніцтвам праф. Гінзбурга, хору, смычковага квартэту і салісткі Л. Александроўскай. У рэпэртуары канцэрту — былі выкананы творы Чайкоўскага, Вагнэра і іншых клясыкаў музыкі, чарод твораў беларускіх савецкіх кампазытараў—„Фінал сымфанэты“ (на беларускія народныя тэмы) Чуркіна, „Лявоніха“ Залатарова, „Лянок“ у апрацоўцы Туранкова, „Позна сонца“ у апр. Палонскага і інш. Бел. народн. песьні выканала артыстка Александроўская.

═ „Чыстка“ ў беларускіх савецкіх пісьменьнікаў. Менская камуністычная газэта „Зьвязда“ (№ 69 і 70) у канцы сакавіка надрукавала артыкулы паэта Александровіча і Алеся Кучара аб выкрыцьці „ворагаў“ народу—„трацкістаў, правых, нацыяналістаў.“ Да гэткіх залічаюцца: Цішка Гартны (З. Жылуновіч), паэт і пісьменьнік, ведамы яшчэ перад кастрычніцкай рэвалюцыяй, як тварэц беларускай пралетарскай літаратуры (нарадзіўся ў 1887 г., браў учасьце у рэвалюцыйным руху ад 1904 г., ад 1918 г. сябра камуністычнае партыі Беларусі, у 1919 г. — першы старшыня рэвалюцыйнага ураду БССР, у 1929 г. выкінуты з компартыі за „нацдэмаўшчыну“), маладзейшы беларускі пралетарскі паэт і пісьменьнік Міхась Чарот (псэўдонім Міхася Кудзелькі, нарадзіўся ў 1896 г. камуніст, увайшоў у беларускую літаратуру ў 1922 г.), пісьменьнік Міхась Зарэцкі (псэўдонім Міхася Косянкова, нарадз. ў 1901 г., сябра КП(б)Б, учасьнік грамадзянскай вайны), ведамыя бэлетрысты і пісьменьнікі Сымон Баранавых, Міхась Лынькоў, паэты Алесь Дудар, Кляшторны, Хадыка, Скрыган, Звонак, драматургі Вольны, Сташэўскі і інш. Усім ім ставіцца закіды, быццам яны імкнуліся „адарваць квітнеючую Савецкую Беларусь ад вялікага і магутнага савецкага саюзу, прадаць свабоду і шчасьце беларускага народу разьюшанаму фашызму,“ — „адарваць, адваяваць ад партыі і народу яго паэтаў і пісьменьнікаў,“ „адарваць ад брацкага і магутнага рускага народу і яго слаўнай перадавой культуры.“

На нашу думку ўся справа ня ў гэтых закідах, але сусім у чым іншым і роля тут Александровіча і Кучара няцікавая. Мы праканаены, што выступленьні іх проціў беларускіх пісьменьнікаў разьбіваюць і аслабляюць беларускія культурныя сілы і прыносяць беларускаму працоўнаму народу і яго народнай культуры вялікую шкоду.

═ Аб'еднаньне мастакоў „Белмастак“ працуе над стварэньнем чатырох вялікіх скульптурных груп для беларускага павіліёну Усесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Скульптуры між іншым будуць уяўляць некаторыя варыянты з беларускага народнага танцу „Лявоніха“.

═ 24—29 сакавіка адбыўся ў Менску сход беларускіх савецкіх пісьменьнікаў. Сход выслухаў справаздачу ўраду саюзу пісьменьнікаў і прызнаў яе нездавальняючай. Выступалі з крытычнымі і самакрытычнымі прамовамі многія пісьменьнікі. Якуб Колас у сваей прамове падчыркнуў значны адрыў пісьменьнікаў ад савецкай сапраўднасьці. Паводле думкі Коласа гэтая зьявя не дае пісьменьнікам магчымасьці пісаць творы яркія і тэматычна сьвежыя.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Ad. Stankiewič, Mahnušeŭski, Paŭluk Bachrym, Babroŭski. Bač. 48. Wyd. „Biełpres“. Wilnia 1937.
Міхась Васілёк, З сялянскій ніў. Бач. 32. Выд. Р. Шырмы. Вільня 1937.
S. Paŭłowič, Zasieŭki, Biełaruski lemantar dla chatniaha nawučańnia. Bač. 88. Wyd. „Biełpres“. Вільня 1937.
Беларускі Летапіс, № 1 - 5. Вільня, 1937.
Lietuviu Tauta, Lietuviu Mokslo Draugijos raštai, V knyga. Вільня 1936.
Jaunuju Velykos, Vienkartinis Jaunuju kurybos Leidinys. Вільня 1937.
Varguoliu Dainos. Вільня 1936.
Varsnos. Вільня 1937. Meta 1.
Рідна Мова, ч. 3, 4, 5. Варшава 1937.
Богословія, кн. 1. Львоў 1937.
Вістнік, ч. 4, 5. Львоў 1937.
Назустріч, ч. 7, 8, 9, 10, 11. Львоў 1937.
Katolik, Č. 1—9. Прага 1937.
Der christliche orient, кн. 1, 2. Мюнхен 1937.
Pax, № 1—8. Вільня 1937.
Sprawy Narodowościowe, № 4—5, 6. Варшава 1936.

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя ня мае ў сябе кніжкі першай „Калосься“ з 1936 г. (усе экзэмпляры разышліся), дзеля чаго ня можа яе выслаць патрабуючым. Зварачваемся да В. П. Чытачоў з просьбай: калі хто можа, хай прышле нам першую кніжку „Калосься“ з 1936 г. Узамен атрымае адзін экзэмпляр або два (калі захоча) іншай кніжкі — з тых, што выйшлі з друку, ці з тых, што выйдуць.

